КАМУ КЛАСІКІ ПРЫСВЯЧАЛІ ЛЮБОЎНУЮ ЛІРЫКУ 8





ЛЕГКААТЛЕТКА ІРЫНА ЖУК ПРА СПОРТ І АСАБІСТАЕ 12


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 САКАВІКА 2021 г. СУБОТА № 52 (29421)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ЛУЦКІ, міністр інфармацыі:**

*«Мы бачым, як імкліва мяняецца свет. Адбываецца інфармацыйная каланізацыя: нам навязваюць догмы, меркаванні, якія нам не ўласцівыя. Памяць пра Вялікую Айчынную вайну, пра тую трагедыю, якая закранула тысячы вёсак Беларусі, павінна нам казаць, што суверэнітэт і незалежнасць — гэта вялікія дасягненні, якія беларусы абаранілі ў тыя гады, а мы павінны адстаяць цяпер».*

З першых вуснаў

# «Мы будзем адзінай дзяржавай. Мы нікому не будзем кланяцца»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў Гродзенскую вобласць

**Паглядзець, як працуе адзін з найлепшых перапрацоўшчыкаў малака ў краіне і натхніцца вынікам своечасова праведзенай мадэрнізацыі ў гэтай галіне — такія мэты візіту назваў беларускі лідар у размове з калектывам гродзенскага «Малочнага Міра». Паказальна, што знаёмства з вырабам сыроў Аляксандр Лукашэнка пачаў з... фермы, якая пастаўляе для гэтага малако.**

### ПРАЦАВАЦЬ ПА-ГАСПАДАРСКУ

Абухава — выдатны аграгарадок прыкладна за 10 кіламетраў ад Гродна. У ім свая спартыўная школа, кафэ, бар, цэнтр культуры, царква, нядаўна ўзвялі новыя шматкватэрныя дамы для тых, хто не мае ўласнага жылля. Наўрад ці магчыма было стварыць такую маштабную сацыяльную інфраструктуру, калі б у пасёлку не размясціўся адміністрацыйны цэнтр сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва імя І. П. Сянько. Імя прадпрыемства атрымала ў памяць пра былога старшыню Ілью Пятровіча Сянько, які кіраваў калектывам паўвека і вывеў калгас у лік перадавых гаспадарак краіны. СВК размяшчаецца на тэрыторыі 20 вёсак з 22, якія належаць да Абухаўскага сельсавета.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# Час класці камяні



Кансервацыю з рэстаўрацыяй гісторыка-культурнай каштоўнасці пад назвай «Фрагменты замка XIV стагоддзя ў вёсцы Крэва Смаргонскага раёна» вядуць спецыялісты ААТ «Белрэстаўрацыя», а менавіта будаўнікі з участка, які знаходзіцца ў Міры Карэліцкага раёна. Завяршаецца першая чарга будаўніцтва пятага пускавога комплексу гэтага знакавага і эксклюзіўнага ў плане будоўлі аб'екта нашай мінуўшчыны. Будаўнікі давяршылі другую сцяну — паўночна-заходнюю і цяпер накрываюць яе керамічнай дахоўкай. А яшчэ над уязной брамай выкладваюць адмысловай цэглай галерэйную пляцоўку. І робяць адказную работу муляры Аляксандр РАЖАНСКІ (*на фота справа*) і Юрый САЛАЎЁЎ.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



## КОРАТКА

• **Міністэрства культуры абвясціла конкурс на найлепшы праект патрыятычнай тэматыкі.**

• На службу ва Узброеныя Сілы сёлета прызавуць да 100 маладых афіцэраў запасу.

• **КДК устанавіў парушэнні дысцыпліны цэн у кожнай чацвёртай праверанай краме.**

• Іркуцкая вобласць набудзе больш за 160 трактароў BELARUS.

• **«Белавія» аднаўляе рэйсы з Мінска ў Баку з 20 сакавіка.**

• Дзяржстандарт забараніў у Беларусі малочную і масла-тлушчавую прадукцыю ПУП «БЕЛ-МАЛ».

• **Да Міжнароднага дня лясоў у Беларусі правядуць 100 бясплатных экскурсій.**

• Абмежаванні на лоўлю рыбы з 20 сакавіка ўводзяцца ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях.

• **Больш за трэць зваротаў з нагоды парушэння правоў спажыўцоў у 2020 годзе датычыліся гандлю.**

Размова па сутнасці

# ЛЮДЗІ І ІХНІЯ СІМВАЛЫ

## Якую ролю дзяржаўная і нацыянальная сімволіка іграе ў жыцці краіны і грамадства

**У падзеях, якія апошнія паўгода адбываюцца ў палітычным жыцці нашай краіны, не апошнюю ролю іграюць... сцягі. Прынамсі, ролю эмацыянальна-візуальную, і з гэтым не паспрачаешся. «Скажы мне, які твой сцяг, і я скажу, хто ты», — гэта прымітыўная, здавалася б, формула, дзейнічае сёння амаль заўсёды. Ва ўсялякім разе, так мяркуюць тыя, хто пад палотнішчам пэўных колераў выказвае сваю пазіцыю. Ці ўнікальная Беларусь у гэтай сітуацыі? Што нам гаворыць пра выкарыстанне, прызнанне, забарону той ці іншай сімволікі гістарычны міжнародны досвед? Чаму для беларусаў гэта тэма, як, бадай, ні для кога іншага, наўпрост звязана з веданнем ці нежаданнем ведаць уласную гісторыю? Што рабіць, каб пытанне сімволікі не стала раздзяляльным для нашага грамадства фактарам?**

СТАР. 4-5

ISSN 1990 — 763X

21052

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «Мы будзем адзінай дзяржавай. Мы нікому не будзем кланяцца»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аграгарадок стаў першым пунктам, з якога пачаў сваю рабочую камандзіроўку ў Гродна Прэзідэнт. Спачатку, як звычайна, — даклады: аб сацыяльна-эканамічным развіцці вобласці, раёна і ў завяршэнні аб становішчы прадпрыемства.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік далажыў Прэзідэнту, што ў пандэмійным 2020 годзе валавы рэгіянальны прадукт не толькі не знізіўся, але і трохі прырос. Гэта стала магчыма дзякуючы прамысловасці, сельскай гаспадарцы, росту экспарту паслуг і тавараў, захаванню інвестыцый. Падрабязней кіраўнік рэгіёна спыніўся на інвестыцыйных праектах, што рэалізуюцца ў вобласці, — рэканструкцыі чыгуначнага моста ў аўтамабільны, будаўніцтве анкадыспансера. Прыцягваюць інвестараў у лагістычны цэнтр у свабоднай эканамічнай зоне ў Смаргоні, у Свіслачы пачалося будаўніцтва дрэваапрацоўчага завода.

Па словах Уладзіміра Караніка, і жывёлагадоўчы комплекс вобласці дэманструе ўстойлівае развіццё па ўсіх кірунках, але за апошнія пяць гадоў колькасць удойнага статка кароў не павялічылася. Рост паказчыкаў — за кошт тэхналогій, інтэнсіўнасці працы. «Павялічыўся ўдой на адну карову, што прывяло да 20 % павелічэння валавога надою», — дадаў ён. На думку губернатара, не павінна быць разыходжання па ўзроўні ўдою паміж рознымі раёнамі і прадпрыемствамі. Да гэтага сёння імкнуцца гаспадаркі рэгіёна.

Прэзідэнт заўважыў, што колькасць кароў неабходна павялічваць. Тут міністр сельскай гаспадаркі Іван Крупко прывёў у прыклад Брэсцкую вобласць, дзе ідзе разам павелічэнне экстэнсіўнасці (3—4 тысячы галоў у год) і інтэнсіўнасці (на 5—8 % валавога прадукту) жывёлагадоўчага працэсу.

«Мабыць, гэта і ёсць той шлях, па якім мы павінны ісці, павялічваючы колькасць галоў і паслядоўна замяшчаючы на кароў высокаўдойных», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Закрануў губернатар пытанне гатоўнасці вобласці да пасяўных работ: «Ніякіх рызыкаў не бачу. Устаноўлены тэрміны, тэхніка, людзі ёсць. Насенны фонд гатовы. Дапрацоўваем толькі грэчку, колькасць якой павялічылася».

Кіраўнік Гродзенскага райвыканкама Ян Васілеўскі абазначыў, што ўсе 16 сельгасарганізацый раёна спрацавалі з прыбыткам. Гаспадаркі наблізіліся да яго мары аб надоях — 9000 літраў малака ў год з каровы. Ян Васілеўскі дадаў, што па ўзроўні заробкаў на сяле раён разам з Астравецкім — лідары ў вобласці.

Старшыня СВК Валерый Шумель далажыў пра становішча і перспектывы сваёй гаспадаркі. Чысты прыбытак, па яго словах, складае 15 мільёнаў рублёў. Асаблівую ўвагу звяртаюць на рост прадукцыйнасці статка. Добрыя паказчыкі вытворчасці даюць магчымасць развіваць і сацыяльную сферу. Летась пабудавалі 16-кватэрны жылы дом за кошт гаспадаркі і ў чатырох дамах зрабілі капрамонт.

«Да нас прыходзіць моладзь, людзі з іншых месцаў. Сёння мы амаль задаволілі чаргу тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Застаўся адзін чалавек. Але ўжо ёсць людзі, якія прыходзяць, пішуць заявы, і мы ставім іх у чаргу. Калі спатрэбіцца, мы яшчэ пабудуем дом», — заявіў Валерый Шумель.

Падводзячы вынік наведвання малочнатаварнага комплексу, Прэзідэнт высока ацаніў дасягненні гаспадаркі.

«Добры комплекс, добры тым, што з розумам зрабілі. Нічога не разбуралі, мадэрнізавалі. Не горш, чым на новым. Але ўсё роўна глядзіце наперад, калі рызыкнеш на робаты перайсці, на сучасныя тэхналогіі, мы з Уладзімірам Сцяпанавічам (Каранікам. — **«Зв.»)** падключымся. Калі добрай гаспадарцы дапаможаш, ведаеш, што не ўпустую», — рэзюмаваў візіт Аляксандр Лукашэнка.

## «МАЛОЧКА» ДЛЯ КІТАЯ І ПРЭЗІДЭНЦКІ ПАРМЕЗАН

Малако з малочнатаварнага комплексу ў «Абухаве» ідзе і на ААТ «Малочны Мір». Марына Анікеева, генеральны дырэктар прадпрыемства, шмат казала падчас сустрэчы з Прэзідэнтам пра тое, як працуюць з вытворцамі сыравіны, ствараючы поўны высакаякасны вытворчы ланцуг.

На галоўнай пляцоўцы ў Гродне ў суткі вырабляюць 40 тон гатовага прадукту, перапрацоўваючы 400 тон малака, спецыялізуюцца на вырабе сыроў. Акрамя гэтага завода, у акцыянернае таварыства ўваходзяць два цэхі «Бераставіца» і «Скідзель», участак разліву безалкагольных напояў і мінеральных водаў «Парэчча», малакапрыёмныя пункты, сельскагаспадарчае прадпрыемства «АграМір», Шчучынскі і Дзятлаўскі філіялы.

«Сыравінная зона вельмі лаканічна вакол нас знаходзіцца. Наша асноўная мэта і задача — быць з імі разам. Вы толькі што наведалі гаспадарку, якая ўваходзіць у нашу сыравінную зону. Мы разам праходзілі шлях па еўраакрэдытацыі прадукцыі на пастаўкі ў краіны ЕС», — паведаміла Марына Анікеева.

Яна адзначыла, што вялікі гонар кампаніі — гандляваць толькі гатовым прадуктам, які больш рэнтабельны, чым сыравіна.

«Была пастаўленая задача працаваць з Кітаем. Нам не верылася, што можна працаваць з Кітаем. Не таму што ён далёкі, а таму што мы вельмі розныя па смакавых перавагах. Але мы знайшлі там сваю нішу і не толькі па сухіх прадуктах, але і па гатовых», — расказала гендырэктар.

Кіраўніку краіны на выстаўцы прадукцыі прэзентавалі навінку «Малочнага Міра» — пармезан «Прэзідэнт».

Адзін з тэхнолагаў, прадстаўляючы Аляксандру Лукашэнку прадукцыю, заўважыў, што сыр — адзін з самых карысных прадуктаў у малочнай прамысловасці з-за збалансаванай колькасці тлушчу/бялку ў прадукце. Плюс ён дапамагае выпрацоўцы сератаніну, так званага гармону радасці.

«Буду есці цяпер сыр, бо шчасце ўсім трэба», — пажартаваў кіраўнік краіны.

## «І АСАБІСТАЕ, І ДЗЯРЖАЎНАЕ ПЕРАМЯШАНА»

Прэзідэнт пагутарыў і з работнікамі кампаніі. Сустрэчу з калектывам «Малочнага Міра» ён пачаў з традыцыйнага адказу на традыцыйнае пытанне пра мэту візіту.

«Хацелася паглядзець на вядучае прадпрыемства ў Гродзенскай вобласці і адно з лепшых (не магу сказаць «найлепшае» — пакрыўдзяцца іншыя) прадпрыемстваў нашай краіны, — сказаў ён. — Гэта першае. Другое — асабістае. Гадоў 15 таму, не памятаю ўжо дакладна, я спрабаваў вас падштурхнуць да шляху мадэрнізацыі малаказаводаў, як мы іх называлі ў нашай краіне».

Прэзідэнт назваў вынік адным з найвялікшых дасягненняў Беларусі разам з мадэрнізацыяй асобных дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў.

***«Своечасова мы спахапіліся, прывялі ў парадак: малакаперапрацоўчыя прадпрыемствы ў Беларусі ўсе вельмі добрыя. Калі б мы тады гэтага не зрабілі, мы не мелі б такога эфекту,*** — сказаў ён. — ***А зараз мы маем у тым ліку і фінансавы эфект, бо першыя за гэта ўзяліся».***

Яшчэ адзін асабісты інтарэс — перапрацоўка сыроваткі, дадаў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, як калісьці ў Бялынічах выпадкова даведаўся, што значную частку сыроваткі пры вытворчасці сыроў выліваюць.

«Для мяне, вясковага чалавека, які вырас з малаком, гэта было жахліва. Сёння ўжо ніводнай тоны, кілаграма малака мы ў каналізацыю не выліваем. Таму тут і асабістае, і дзяржаўнае перамяшана», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што пабываў ужо, напэўна, на ўсіх малакаперапрацоўчых прадпрыемствах краіны, і яго такія візіты натхняюць.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што перажываў, ці будзе попыт на сыры, бо ў свой час падштурхнуў айчынных малакаперапрацоўшчыкаў на іх выраб. Генеральны дырэктар ААТ «Малочны Мір», па яго словах, пераканала, што попыт на сыры будзе заўсёды.

«Значыць, мы зрабілі правільна», — парадаваўся кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў важнасць работы над дыверсіфікацыяй экспарту. Не трэба зацыклівацца на адным рынку, для ўстойлівасці трэба абапірацца на розныя пункты, і чым іх болей, тым лепш, падкрэсліў Прэзідэнт.

«Калі я быў на жывёлагадоўчым комплексе ў Абухаве, паглядзеў, як вырабляюць вельмі добрае малако, убачыў, што ў лабараторыі прэтэнзій у вас да малака ўсёй сыравіннай зоны няма, значыць, сістэма працуе, — падсумаваў беларускі лідар. — Вядома, ёсць над чым працаваць, у вас ёсць шмат планаў, недзе будзем падтрымліваць, дапамагаць. Ну, думаю, вы ўжо і на свае сілы павінны разлічваць».

Прэзідэнт пахваліў перапрацоўшчыкаў за адносіны з пастаўшчыкамі сыравіны.

«Вы ўжо ўвязлі ў гэтай сыравіннай зоне, і гэта таксама добра, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Гэта сведчыць пра тое, што малочнатаварныя комплексы ўжо не чужыя для вас. Яны вашы, вы разумееце, што, калі не будзе малака з гэтых зон, значыць, будзе бяда. Я задаволены».

Кіраўнік дзяржавы пажадаў суразмоўцам, каб ім заўсёды ўсяго хапала, і паабяцаў з боку дзяржавы дапамагаць, калі неабходна, з продажам прадукцыі кампаніі.

## ДЫВЕРСІФІКАЦЫЯ ПА-РАНЕЙШАМУ НЕАБХОДНАЯ

Менавіта дыверсіфікацыі датычылася першае пытанне кіраўніку дзяржавы ад супрацоўнікаў кампаніі. Летась «Малочны Мір» паставіў у Кітай прадукцыі на суму 4,5 мільёна долараў, што ўтрая больш за ўзровень 2019 года. Аднак беларускім малочным кампаніям няпроста нарошчваць продажы ў гэту краіну, бо парог уваходу на яе рынак вельмі высокі, заўважыла работніца прадпрыемства. «Ці адказнае за гэта толькі само прадпрыемства або ўсе органы, ад стандартаў да мытні, павінны аказваць садзейнічанне нашым беларускім прадпрыемствам па нарошчванні экспартнага патэнцыялу ў КНР?» — спытала яна.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што на рынак Кітая імкнуцца ўсе, бо ён вялізны. Але, па-першае, паміж лідарамі Беларусі і Кітая ўсталяваліся па-сапраўднаму сяброўскія адносіны, што дазволіла ў свой час беларускім вытворцам зайсці туды. Цяпер яны пацяху разварочваюцца. І тут, сапраўды, важна адпавядаць усім патрабаванням кітайскіх кантралёраў, якія, бадай, самыя строгія, бо ахвотных пастаўляць туды прадукцыю шмат.

Па-другое, адзначыў Прэзідэнт, чыгуначная магістраль новага «Шаўковага шляху» пралягае праз нашу краіну. «Яны вязуць у Еўропу свае тавары, і мы дамовіліся, што назад у гэтыя кантэйнеры загружаем сваю прадукцыю, і сямімільнымі крокамі пачалі нарошчваць пастаўкі туды», — расказаў ён.

Цяпер кітайскі рынак, у адрозненне ад расійскага, не з'яўляецца прэміяльным для беларускіх вытворцаў, заўважыў Аляксандр Лукашэнка, але ён вельмі важны для дыверсіфікацыі экспартных паставак. З гэтага пункту гледжання нам могуць быць цікавыя Індыя і Пакістан, дадаў ён, гэтак жа, як і Еўрасаюз, куды гродзенскія малакаперапрацоўшчыкі ўжо пратарылі сцежку.

Прэзідэнт паабяцаў улічыць крытыку дзяржаўных органаў у недастатковай дапамозе беларускім прадпрыемствам у гандлі з Кітаем, якую пачуў у пытанні прадстаўніцы «Малочнага Міра».

## ШТО Ў КОШЫКУ ДЛЯ ПУЦІНА?

Другое пытанне датычылася кошыка з беларускімі прадуктамі, які Аляксандр Лукашэнка нядаўна падарыў свайму расійскаму калегу ў Сочы. Ці была там прадукцыя «Малочнага Міра», цікавіла гродзенцаў. Прэзідэнт шчыра адказаў, што не ведае і растлумачыў, што ў такія кошыкі абавязкова трапляюць навінкі прадукцыі.

«Калі ў вас на той час былі навінкі, якіх не было раней у сетцы (гандлёвай. — **«Зв.»**), то абавязкова там быў ваш прадукт», — сказаў ён і дадаў, што адносіны і Уладзіміра Пуціна, і ўвогуле расіян да беларускай харчовай прадукцыі самыя добрыя.

Кіраўнік дзяржавы паабяцаў наперад заўсёды звяртаць увагу на тое, прадукцыя якіх беларускіх кампаній трапляе ў падобныя падарункавыя кошыкі.

## УТРЫМАЦЦА АД «БОЙКІ ВАКЦЫН»

Адно з пытанняў датычылася статыстыкі захваральнасці на COVID-19 сярод дзяцей і моладзі ў сувязі з небяспекай брытанскага штама новага каранавіруса для гэтай катэгорыі насельніцтва.

Аляксандр Лукашэнка адказаў, што ў Беларусі няма вострай праблемы ў гэтай сувязі, і паабяцаў, што з боку дзяржавы будзе зроблена ўсё, каб яна не паўстала.

«Мяне вельмі насцярожваюць у гэтым плане апошнім часам дзве рэчы, — падзяліўся ён. — Першае — бойка вакцын. Разумееце, адзін аднаму ўчапіліся ў горла (кажуць, у некалькі трыльёнаў рублёў рынак па вакцынах)».

Прэзідэнт прызнаўся, што ў гэтым плане яму падабаецца падыход Кітая, які мае ўласную вакцыну, што добра сябе зарэкамендавала, але ставіцца да сітуацыі спакойна.

У Беларусі няма нездаровага ажыятажу на згаданай тэме, але гэта не значыць, што яна стаіць убаку ад сусветнага працэсу стварэння вакцын. Хутка мы пачнём вырабляць расійскую вакцыну, паралельна распрацоўваем уласную, напомніў Аляксандр Лукашэнка.

«Другое, што мяне насцярожвае, — быццам спецыяльна падаграваюць гэтую тэму», — дадаў беларускі лідар і звярнуў увагу на тое, што падчас амаль кожнай пандэміі знаходзяцца тыя, хто на іх зарабляе.

## ТРЫМАЦЦА СВАЙГО

Апошняе пытанне ад супрацоўнікаў кампаніі датычылася захавання адзінства ў беларускім грамадстве. Яго гродзенцы звязалі з нядаўняй датай 100-годдзя падпісання Рыжскага дагавора, у выніку якога Беларусь была падзеленая, і частка яе аддадзеная Польшчы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яшчэ да прэзідэнцкіх выбараў падчас сустрэч з актывам розных рэгіёнаў паказваў карту Беларусі 1921 года і казаў, што не хоча, каб было так.

«Я адчуваў нутром (у мяне не было фактаў, як зараз), што ***нас пачынаюць ірваць. І часта казаў пра тое, што Беларусь — на разрыў»,*** — напомніў ён.

***«Напярэдадні выбараў я заўсёды казаў падчас выступленняў, што нам гэта пагражае, беларусы, ачніцеся, вы можаце атрымаць гэта.*** Некаторыя гэтага не пачулі, у тым ліку і ў Гродне. Таму ***хачу вам сказаць: пры мне гэтага не будзе. Мы будзем адзінай дзяржавай. Мы нікому не будзем кланяцца. Мы не будзем стаяць на каленях. Горш жыць мы не будзем толькі ў тым выпадку, калі захаваем галаву на плячах.*** Паверце, вельмі правільна ўкраінцы кажуць: беларусы не палоханыя, не бітыя. А я ім кажу: ***не хачу, каб беларусаў білі і палохалі.*** Бо гэта — катастрофа. Гэта страшна. ***Жывём як можам і не горш за іншых. Таму трымайцеся сваёй зямлі»,*** — рэзюмаваў Прэзідэнт.

У Год народнага адзінства важна разумець, што гэта — наша зямля, падкрэсліў беларускі лідар.

***«Трэба быць бліжэй адзін да аднаго,*** — параіў ён. — ***Свет звар'яцеў, і людзі ў гэтым свеце страцілі арыентацыю.*** А ў гэты момант не трэба кідацца ў розныя бакі, таму я і аб'явіў гэты год Годам народнага адзінства. Вядома, усе мы не будзем побач. Ёсць такія, каму шмат не падабаецца. ***Трэба пацярпець, бо пераважная большасць хоча жыць мірна і спакойна.*** Статыстычныя даследаванні паказваюць, што пад 80 працэнтаў людзей баяцца страціць стабільнасць і парадак у краіне. Гэта дарагога варта. Людзі зразумелі, што маглі або могуць страціць, і нам гэтага дапусціць нельга».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Марыя ДАДАЛКА,**
**г. Гродна.**

Блізкая ўлада

# Задаць пытанне губернатару

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ сустрэўся з выкладчыкамі і студэнтамі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога. Адно з пытанняў, якое ўзнялі падчас сустрэчы, — працаўладкаванне маладых спецыялістаў.**



Фота Ганны ПАШЧАНКІ.

Ва ўніверсітэце кіраўнік рэгіёна азнаёміўся з апошнімі навуковымі распрацоўкамі студэнтаў і выкладчыкаў. На выстаўцы можна было ацаніць дыпломныя праекты выпускнікоў ВНУ — рабочыя макеты высокатэхналагічных прылад.

Падчас сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі ў аўдыторыі Генадзь Салавей звярнуў увагу на задачы, якія пастаўлены перад рэгіёнам і будуць вырашацца ў найбліжэйшую пяцігодку. У прыярытэце — здаровая сям'я, эфектыўны менеджмент, нарошчванне экспарту, развіццё рэгіёнаў.

— Прымаючы стратэгію развіцця на 2021—2025 гады, мы арыентаваліся на тыя праблемы, якія ёсць у рэгіёне, — адзначыў старшыня аблвыканкама. — Немалаважныя застаюцца інвестыцыі ў інавацыйную дзейнасць. Таму што без укаранення новых тэхналогій, распрацовак немагчымая эфектыўная мадэрнізацыя і ўдасканаленне прадпрыемстваў. У нас ёсць інавацыйны фонд, мы гатовыя падтрымаць перспектыўныя праекты студэнтаў і выкладчыкаў.

Генадзь Салавей адзначыў, што сёння ў рэгіёне належную ўвагу аддаюць развіццю раёнаў, у тым ліку і пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На Гомельшчыне рэалізуюцца важныя праекты ў металургіі, нафтаперапрацоўцы, дрэваапрацоўцы, сельгасмашынабудаванні, энергетыцы, здабычы калійных угнаенняў. Губернатар расказаў, якія з'явяцца новыя сацыяльна значныя аб'екты. Так, сёлета ў Гомелі плануюць скончыць будаўніцтва тэхнапарка «Карал». На наступны год у абласным цэнтры намечана будаўніцтва 36 кіламетраў дарожнай інфраструктуры для веласіпедыстаў і абнаўленне Сельмашаўскага пуцеправода. Таксама ў хуткім часе будзе падрыхтавана праектнае рашэнне па басейне «Дэльфін» у Савецкім раёне Гомеля.

Падчас сустрэчы да Генадзя Салаўя паступіла пытанне, ці будуць прадугледжвацца льготныя абанементы на плаванне ў басейне для студэнтаў. Старшыня аблвыканкама запэўніў, — як толькі вызначацца тэрміны рэканструкцыі басейна, да гэтага пытання абавязкова вернуцца і дэталёва разгледзяць. Спыталі ў губернатара і пра тое, якія, на яго погляд, прадпрыемствы ў рэгіёне «топавыя» для працаўладкавання маладых спецыялістаў.

— У любой сферы патрэбны новыя кадры, калі спецыялісты зацікаўлены працаваць і дасягаць поспехаў. Як той казаў, было б жаданне. Акрамя таго, выпускнікі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога цэняцца не толькі ў нашай вобласці, але і ва ўсёй краіне. Многія працуюць на БМЗ, «Гомсельмашы», «Беларуснафце», Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе, Светлагорскім ЦКК, Гомельскім хімзаводзе, — звярнуў увагу Генадзь Салавей.

На думку студэнта пятага курса энергетычнага факультэта ГДТУ імя П. В. Сухога Алега Кныша, падобныя сустрэчы дапамагаюць выпускнікам ВНУ выслухаць меркаванні і парады людзей, якія маюць каштоўны жыццёвы вопыт.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ШОУ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**У Белтэлерадыёкампаніі, якая з'яўляецца арганізатарам нацадбору на міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне» ў Беларусі, адрэагавалі на адмову ЕВС у праве ўдзельнічаць у спаборніцтве з кампазіцыяй «Я навучу цябе» баранавіцкаму калектыву «Галасы ЗМеста».**

У песні ўбачылі як першапачатковым выглядзе, якая выклікала даволі ажыўленае абмеркаванне на прасторах інтэрнэту, у Еўропе ўгледзелі быццам бы палітычны кантэкст. А гэта, як вядома, супярэчыць фармату конкурса. Таму арганізатарам нацадбору Беларусі запрапанавалі альбо знайсці іншага прадстаўніка, альбо змяніць тэкст першапачатковай кампазіцыі.

Старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант у эфіры тэлеканала АНТ пракаментаваў сітуацыю наступным чынам: «Улічваючы наша супрацоўніцтва з Еўрапейскім вяшчальным саюзам, мы, у сваю чаргу, запрапанавалі гурту «Галасы ЗМеста» прадставіць нам іншы варыянт існуючай кампазіцыі або новую песню. І зараз, наколькі мне вядома, вядзецца актыўная работа ў гэтым кірунку. Мы да ўсяго, што адбываецца, ставімся па-філасофску. Але я перакананы, што песня не мае ніякага палітычнага кантэксту і пра гэта неаднаразова казаў ужо і яе аўтар. Проста кожны трактуе як ёй, як яму выгадна. З пункту гледжання шоу-бізнесу «Еўрабачанне» — гэта шоу. Нам зрабілі адну песню-мільённік. І думаю, што зусім хутка вы пачуеце яшчэ адну песню-мільённік, якую будуць слухаць па ўсёй Еўропе».

На тое, каб прадставіць новую кампазіцыю для ўдзелу ў конкурсе, у «Галасоў ЗМеста» ёсць час да канца сакавіка. Само ж сёлетняе «Еўрабачанне» плануюць правесці ў маі ў Ратэрдаме.

**Алена ДРАПКО.**

Зваротная сувязь

# МЕСЦА СУСТРЭЧЫ — МУЗЕЙ

**Магілёўская моладзь пасябравала з творчым дэсантам ад Саюза пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкага дома «Звязда»**

**На сустрэчы, якая адбылася ў Магілёўскім мастацкім музеі імя П. Масленікава, была магчымасць пазнаёміцца з кнігамі выдавецтва, прысвечанымі Беларусі, і некаторымі іх аўтарамі, паглядзець фотавыстаўку Уладзіслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой», якая суправаджала важныя кніжныя святы краіны і экспанавалася на значных пляцоўках Беларусі і за мяжой, а таксама пачуць з першых вуснаў гісторыі з багатага на цікавыя выпадкі і гучныя імёны жыцця народнага артыста Беларусі Эдуарда Ханка.**

— Жыхарам і гасцям нашага горада будзе вельмі карысна пазнаёміцца з гэтай выстаўкай, такой яркай і запамінальнай, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА** падчас яе адкрыцця. — Хочацца сказаць словы ўдзячнасці Саюзу пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкаму дому «Звязда», які актыўна суправаджае выстаўкі і іншыя значныя мерапрыемствы. Асабіста Алене Стэльмах за яе асветніцкую дзейнасць і ўдзел у мерапрыемствах, якія праходзяць на Магілёўшчыне. Прыемна ўбачыць на гэтай імпрэзе Эдуарда Сямёнавіча Ханка, які ўдзельнічае ў вельмі нечаканых праектах. Гэта добры прыклад моладзі, як трэба вучыцца, жыць і працаваць.



Дарэчы, сустрэча адбылася напярэдадні 15-гадовага юбілею Магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Некаторыя яго аўтары актыўна супрацоўнічаюць з выдавецтвам.

— У ім пабачылі свет дзве мае кніжкі — «Дзіўныя дзеткі» і «Паршакрасавіцкі суп» — паведаміла **магіляўчанка Жанна МІУС.** — Чатыры гады таму я прыслала рукапіс у выдавецтва, і мае творы прыйшліся даспадобы.

Алена Белаiноўжа супрацоўнічае з Выдавецкім домам «Звязда» ўжо не першы год. З 2008 года яна пастаянная аўтарка часопісаў «Маладосць», «Полымя», «Нёман», яе вершы часта друкуе газета «ЛіМ». Летась у выдавецтве выйшла яе прыгодніцкая аповесць «Зорка Ракхігархі» — працяг аповесці, якая друкавалася ў часопісе «Маладосць» у 2014 годзе пад назвай «Чамадан з кракадзілавай скуры».

— Мы з вялікім задавальненнем ехалі ў Магілёў, — прызналася юным аматарам кніг **пісьменніца-публіцыст Алена СТЭЛЬМАХ.** — І фотавыстаўка, і прэзентацыя выданняў — усё гэта даніна павагі нашай Радзіме, у тым ліку такому цудоўнаму краю як Магілёўшчына. Праз творы ў кнігах і на фота мы ўсхваляем нашу родную, прыгожую Беларусь. Сутнасць праекта, які мы ажыццяўляем на працягу пяці гадоў, менавіта невычарпальная любоў да Радзімы і адзінства нашых сэрцаў, жаданне берагчы тое, што маем. Я ўпэўнена, што многія з тых, хто ўбачыць гэтую выстаўку, атрымаюць шмат пазітыўных эмоцый і ўражанняў.

Работы, прадстаўленыя на выстаўцы, упрыгожваюць і маляўнічыя фотаальбомы выдавецтва. Яны добра спалучаюцца з краналынымі вершамі і прозай сучасных паэтаў і пісьменнікаў. У наведвальнікаў была ўнікальная магчымасць набыць гэтыя і іншыя кнігі з аўтографамі аўтараў і атрымаць у падарунак каляндар ад Выдавецкага дома «Звязда».

Падчас прэзентацыі Алена Стэльмах расказала пра асаблівасці стварэння фотаальбомаў і звярнула ўвагу на мілагучнасць і народнасць іх зместу. Была магчымасць паглядзець невялічкі буктрэйлер па матывах гэтых кніг у выкананні навучэнцаў Мінскага педагагічнага каледжа. І вялікае задавальненне публіка атрымала ад сустрэчы з Эдуардам Ханком. Моладзь з захапленнем падпявала аўтару знакамітых песень з рэпертуару Алы Пугачовай, Аляксандра Ціхановіча і Ядвігі Паплаўскай, ансамбля «Сябры».

Напрыканцы сустрэчы Алена Стэльмах уручыла дыпломы Выдавецкага дома «Звязда» шэрагу магілёўскіх аўтараў і супрацоўнікам бібліятэк.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

**● НЕАБХОДНЫ КАМЕНТАРЫЙ**

# «МЫ БУДЗЕМ ПЕЦЬ СВАЕ ПЕСНІ!»

**Парламентарый аб палітыцы конкурсу «Еўрабачанне» ў дачыненні да выбару песні беларускага гурта «Галасы ЗМеста»**

**Лілія АНАНІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:**

— Прапановы змяніць песню не ўкладваюцца, на мой погляд, у межы адкрытага, творчага і сумленнага конкурсу. На вялікі жаль, мы неаднаразова назіралі, што на гэтай пляцоўцы («Еўрабачання». — **«Зв.»**) гучаць далёка не вельмі маральныя песні, якія ў нас, беларусаў, з пункту гледжання нашых маральных каштоўнасцяў, наогул выклікаюць сумненні. Разам з тым у нас выдатная група і выдатная песня. У нас ёсць права на ўласнае бачанне свайго выступлення — а нас хочуць яго пазбавіць.

Аднак ёсць і станоўчае ў гэтай сітуацыі: мы пераканаліся, што там (у Еўрасаюзе. — **«Зв».**) выкарыстоўваюцца ўжо не двайныя, а трайныя стандарты ў адносінах да нашай краіны, прычым па ўсіх кірунках (напрыклад, у спорце, ужо дабраліся да песень). Мы будзем пець свае песні, будзем адстойваць свае інтарэсы, будзем расціць і падтрымліваць сваю моладзь і развіваць сваю краіну!

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Пасаду прэзідэнта Танзаніі ўпершыню ў гісторыі краіны заняла жанчына



Да прысягі была прызведзена Самія Хасан Сулуху, якая раней была віцэ-прэзідэнтам, паведамілі мясцовыя СМІ. Колішні прэзідэнт Танзаніі Джон Магуфулі нечакана памёр ва ўзросце 61 года. Ён знаходзіўся на пасадзе кіраўніка дзяржавы з 2015-га. Магуфулі быў адным з самых прыкметных COVID-скептыкаў у Афрыцы, раіў лячыць каранавірус зёлкамі і малітвамі. Танзанія не друкавала падрабязнасцяў сваіх выпадкаў заражэння каранавірусам з мая мінулага года, а ўрад адмовіўся закупляць вакцыны.

## Даходы японскай эканомікі ад сезона любавання сакурай скароцяцца ў чатыры разы

Даходы японскай турыстычнай галіны, транспарту, грамадскага харчавання і гандлю ад перыяду любавання сакурай скароцяцца ў параўнанні з 2018 годам на 493,5 млрд іен (больш чым $4,5 млрд). Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на інфармацыйнае агенцтва Kyodo. Па разліках вядомага ў краіне эканаміста, ганаровага прафесара Універсітэта Кансай Кацухіра Міямоты, сёлета паступленні складуць не больш за 158,2 млрд іен (каля $1,5 млрд). Падзенне даходаў звязана з абмежаваннямі праз пандэмію. У Японіі цвіценне сакуры ў гэтым годзе пачалося 11 сакавіка з прэфектуры Хірасіма на паўднёвым захадзе галоўнага вострава краіны Хонсю. У Токіа яе першыя кветкі былі заўважаны трыма днямі пазней. Чакаецца, што праз некаторы час надыдзе пара поўнага росквіту сакуры, калі паркі ў краіне літаральна патануць у розных адценнях ружовага колеру.

## Гібралтар вакцынаваў ад ковіду ўсё дарослае насельніцтва

Гібралтар — заморская тэрыторыя Вялікабрытаніі — завяршыў уласную праграму па вакцынацыі сваіх дарослых грамадзян ад каранавіруса, якія пажадалі зрабіць прышчэпку. Аб гэтым паведаміў The Washington Post са спасылкай на брытанскія ўлады. Міністр аховы здароўя Вялікабрытаніі Мэт Хэнкак назваў Гібралтар «першай краінай у свеце, якая завяршыла праграму поўнай вакцынацыі дарослых». The Washington Post адзначыў, што «яшчэ меншы Ватыкан прэтэндуе на гэты тытул». Выданне паведаміла, што ва ўсім Гібралтары на невялікай тэрыторыі жыве ўсяго каля 30 тысяч чалавек, што спрыяла хуткай вакцынацыі. Дапамагло і тое, што Гібралтар з'яўляецца заморскай тэрыторыяй Вялікабрытаніі: гэта аблегчыла доступ да вакцыны.

**Надзённыя пытанні абмеркавалі падчас круглага стала ў «Звяздзе» Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, доктар гістарычных навук, Вадзім ГІГІН, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, кандыдат гістарычных навук, Сяргей ТРАЦЦЯК, загадчык аддзела навейшай гісторыі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдат гістарычных навук, Алег ДЗЯРНОВІЧ, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдат гістарычных навук, Наталля ГОЛУБЕВА, кандыдат гістарычных навук.**

# ЛЮДЗІ

## Якую ролю дзяржаўная і нацыянальная сімволіка

***«ЗВЯЗДА»: Калі сёння гаварыць пра дзяржаўную і нацыянальную сімволіку, нельга не закранаць тэму перадумоў яе ўзнікнення. Пытанне здаецца філасофскім, але менавіта разуменне гэтай філасофіі дае веданне, што сцяг — гэта не проста палотнішча са спалучэннем пэўных колераў. (А калі гаварыць шчыра, для многіх гэта так і ёсць.)***

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Несумненна, любая сімволіка, акрамя фарбаў і знакаў, мае пэўныя сэнсы, нясе пэўны кантэкст, з'яўляецца той ці іншай праграмай, якая фармулюецца, калі ўзнікае нацыя і дзяржаўнасць, мае пэўныя ідэалагічныя канстанты. Калі мы кажам пра сімволіку — у Сярэднявеччы нацыянальных сцягоў не існавала, — былі дзяржаўна-генеалагічныя, як і гербы. А ўласна нацыяналізацыя гэтых сімвалаў адбылася ў эпоху фарміравання нацый — а гэта XIX — пачатак XX стагоддзя. Але ў любым выпадку кожная дзяржаўная сімволіка — гэта заўсёды рэпрэзентацыя дзяржавы і апеляцыя да той ці іншай традыцыі. Так было, так ёсць, так будзе. Важнейшы момант пабудовы любой дзяржавы — гэта фарміраванне ўласнай ідэнтычнасці. І сімвалы тут іграюць вялікую ролю.

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Усякі сімвал сапраўды звязаны з нейкай праграмай. Дзяржаўную ці нацыянальную сімволіку нельга намаляваць на каленцы, як і нельга прымусіць усіх у яе паверыць.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Якім нацыянальным і дзяржаўным сімвалам быць, як гэта ні банальна гучыць, вызначае менавіта народ, нацыя, соцыум, прымаючы іх або не. Але сімволіка не «вырастае» з глыбіні народа. Спачатку да яе стварэння прычыняецца пэўная група палітычна актыўных інтэлектуалаў, а потым, у залежнасці ад таго, як адбываецца гістарычнае развіццё, усімі астатнімі людзьмі гэта або ўспрымаецца, або адмаўляецца.

**Алег ДЗЯРНОВІЧ:** Стварэнне пэўнага сцяга — гэта заўжды культурны акт. Заўжды ёсць аўтары, ёсць група, якая работу гэтых аўтараў абмяркоўвае і прымае. І ў нашым усходнееўрапейскім рэгіёне ўсе сцягі, апроч, бадай, расійскага, менавіта такім чынам у канцы XIX — пачатку XX стагоддзя і ствараліся. Калі ўзнікалі маладыя нацыі, новыя дзяржавы, гэта схема працавала заўсёды.

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** І тут трэба звярнуць увагу на адну цікавую акалічнасць: далёка не заўсёды сімволіка нацыянальная супадае з сімволікай дзяржаўнай. Прыклад з гісторыі Францыі. Як мы ведаем, іх нацыянальны трыкалор — прадукт Вялікай французскай рэвалюцыі канца XVIII стагоддзя. Але дзяржаўным сцягам Францыі ён стаў толькі ў 1870 годзе, пасля звяржэння Напалеона III. А дагэтуль, нягледзячы на тое, што трыкалор паважаўся французамі як нацыянальны сімвал, дзяржаўныя сцягі былі абсалютна розныя...

**Вадзім ГІГІН:** Увогуле тут варта сказаць, што датычна сімволікі працуе прынцып — пакуль палітычная сітуацыя ў грамадстве спакойная — і да яе адносіны спакойныя. Як толькі сітуацыя абвастраецца — мяняюцца адносіны і да сімволікі. У згаданай вамі Францыі ў XIX стагоддзі форма кіравання, улада мяняліся некалькі разоў. Адпаведна і барацьба сімволік была надзвычай сур'ёзная. А цягам гадоў трыццаці, у тым ліку пры Напалеоне, за выкарыстанне манархічнага белага з залатымі лілеямі сцяга ўвогуле можна было трапіць на гільяціну.

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Тая ж самая акалічнасць атрымалася і з германскім нацыянальным сцягам. Нацыянальны сцяг — знак буржуазнай рэвалюцыі 1848—1849 гадоў — чорна-чырвона-залаты. Афіцыйны сцяг Германскай імперыі з канца XIX стагоддзя — чорна-чырвона-белы. Пад ім гэта імперыя спрабавала заваяваць сабе месца пад сонцам, развязала Першую сусветную вайну, пад ім жа ў гэтай вайне сканала. У час Веймарскай рэспублікі згадалі пра нацыянальны сцяг і памясцілі ў яго цэнтры арла. З прыходам нацыстаў да ўлады гэты сцяг як знак пераможанай Германіі быў скасаваны, адноўлены імперскі сцяг, аднак побач з ім пачалі шырока выкарыстоўваць і партыйны сцяг нацыстаў са свастыкай. У 1935 годзе яго наогул зрабілі дзяржаўным. Пасля вайны абедзве часткі Германіі ўзялі за аснову нацыянальны сцяг, але ў ГДР на ім яшчэ змясцілі герб (тут варта заўважыць, што, калі на палатно нацыянальнага сцяга змяшчаюць нейкую эмблематыку, — гэта ўжо не нацыянальны сцяг). А імперскі сцяг сёння ў Германіі пад забаронай, як і сцяг са свастыкай, бо і той, і той мае дачыненне да гітлераўскай эпохі.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Любы сцяг і любы герб у залежнасці ад гістарычнага адрэзка часу можа мець дыяметральна супрацьлеглыя канатацыі, напаўняцца розным зместам. Самы класічны агульнавядомы прыклад — свастыка, якая цягам доўгага часу ў індаеўрапейскай культуры ўспрымалася як сімвал сонца і не несла ў сабе нічога негатыўнага. Але пасля выкарыстання фашыстамі яна стала непрымальнай літаральна ва ўсім свеце. Гісторыя ведае не адзін прыклад, калі той ці іншы сімвал, першапачаткова абсалютна нейтральны або нават пазітыўны, у пэўны час у пэўным грамадстве набывае зусім іншы сэнс і асацыяцыі.

**Алег ДЗЯРНОВІЧ:** Што датычыцца сімволікі дзяржаўнай і нацыянальнай, тут яшчэ варта дадаць, што дзяржаўная сімволіка, у адрозненне ад нацыянальнай, мае афіцыйны, замацаваны юрыдычна статус. Нацыянальнай жа дастаткова, скажам так, грамадскага прызнання, каб такой лічыцца. І хоць у большасці нашых суседзяў па Еўропе на сёння нацыянальная і дзяржаўная сімволікі супадаюць, ёсць і іншыя прыклады. З самых свежых — прыклад Чарнагорыі. Там для часткі грамадзян нацыянальным застаўся трыкалор, вельмі падобны на сербскі, але крыху іншага адцення — блакітная паласа замест сіняй. Калі частка нацыянальнай эліты гэтай краіны ўзяла курс на Еўрасаюз, яны, каб ужо зусім адрозніваецца ад Сербіі, у 2004 годзе ўвялі сцяг з імперскай палеалогаўскай традыцыі Візантыі — чырвоны з залатым двухгаловым арлом... І менавіта ён на сёння ў іх дзяржаўны. І гэта можна назваць вельмі моцным палітыка-культурным актам. Але і выкарыстанне трыкалора не абмяжоўваецца.

Дарэчы, няшмат хто ведае, што расійскі трыкалор стаў дзяржаўным толькі пасля каранацыі Мікалая II, у 1896 годзе. Дагэтуль гэта быў сцяг гандлёвага флоту.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Галандцы распрацавалі гэты сцяг па замове Аляксея Міхайлавіча. У час Пятра I пад ім «ваявалі» пацешныя палкі маладога цара. Пасля трыкалор сапраўды стаў сцягам гандлёвага флоту.

**Алег ДЗЯРНОВІЧ:** І тое, што Мікалай II зрабіў гэты па сутнасці нацыянальны сцяг дзяржаўным, было свайго роду актам мадэрнізацыі — што Расія ад імперскага сцяга пераходзіць на сцяг гандлёвы. У гэтым быў таксама закладзены пэўны палітычны пасыл...

У кожнага народа ў гэтым плане, як бачым, свая асаблівая гісторыя. І складаныя сітуацыі з сімволікай праходзілі і сёння праходзяць многія краіны.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Прыклад — Іспанія — там суіснуюць сцягі манархічны (які сёння дзяржаўны) і рэспубліканскі, пад якім выходзіць апазіцыя. У ЗША сцяг дзіксі (паўднёвых штатаў) і афіцыйны дзяржаўны сцяг.

***«ЗВЯЗДА»: У беларусаў, якія як нацыя сфарміраваліся пазней за многія, якія да Кастрычніцкай рэвалюцыі фактычна не мелі ўласнай дзяржавы, гісторыя з сімволікай, можна сказаць, адметная...***

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Беларусы ўвогуле да 1917 года не мелі свайго нацыянальнага, а тым больш дзяржаўнага сцяга.

**Вадзім ГІГІН:** І нават намёку не было на тое, як ён павінен выглядаць.

**Алег ДЗЯРНОВІЧ:** Увогуле, з падобнай праблемай сутыкнуліся і нашы паўночныя суседзі — латышы і літоўцы. Эстонцам было прасцей — яны за аснову сцяга ўзялі колеры студэнцкай карпарацыі ўніверсітэта ў Тарту, якія наносіліся таксама на кукарды студэнтаў.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Калі меркаваць па той фактalагічнай базе, якая ёсць на сённяшні дзень, аб уласным нацыянальным сцягу беларуская нацыянальная эліта задумалася не раней за 1916 год. Прычым — і гэта таксама дакладна вядома — першы па прыярытэце быў не праект бчб-сцяга Клаўдзія Дуж-Душэўскага, а той, які распрацаваў Лявон Вітан-Дубейкаўскі, архітэктар з-пад Мсціслава. Ён у 1916 годзе зрабіў эскіз сцяга алоўкам. На гэтым накідзе прысутнічалі самыя любімыя славянамі колеры: на белым палатне пяць блакітных палос, а ў верхнім куце чырвоны прамавугольнік. У 1917 годзе, перад Усебеларускім з'ездам, быў абвешчаны конкурс на сцяг. І Лявон Вітан-Дубейкаўскі са сваім удасканаленым праектам (сцяг прадстаўляўся як бела-блакітна(сіне)-белы з чырвонай паласой каля дрэўка, прыкладалася таксама карціна, як павінен выглядаць беларускі сцяганосец) прайграў Дуж-Душэўскаму, які прапанаваў ці не чатыры варыянты сцяга...

Увогуле, ёсць сведчанні, што на пачатку ў якасці беларускага сцяга хацелі абраць проста белае палатно, як сімвал Белай Русі. Але белы колер быў колерам арыстакратыі і капітуляцыі. І, паколькі сярод ініцыятараў правядзення Усебеларускага з'езда большасць была сацыялісты рознага кшталту, вырашылі на белым фоне (сімвале Белай Русі) правесці чырвоную паласу — колер чырвонага сцяга, колер народнай крыві і вернасці сацыялістычнай рэвалюцыі. Заўважу, гэта пісаў ва ўспамінах у 1944 годзе Антон Адамовіч, які ў вайну стаў калабарацыяністам, якога нельга западозрыць у сімпатыі да камуністаў...

Таму ўсе размовы, што сцяг выводзіцца з колераў «Пагоні» — нішто іншае, як прыгожая выдумка, якая не мае нічога агульнага са свядомасцю людзей, якія гэты сцяг стварылі, і тым, якія сэнсавыя канатацыі яны ў яго ўкладалі. Дарэчы, яшчэ адзін факт — на Усебеларускім з'едзе побач з БЧБ вісеў чырвоны сцяг — сцяг Беларускай сацыялістычнай грамады, самай старой нацыянальнай партыі.

**Наталля ГОЛУБЕВА:** Дуж-Душэўскі яшчэ прапаноўваў на чырвоную паласу нанесці арнамент — быў і такі варыянт. Мне пашчасціла сябраваць з яго сям'ёй і, можна сказаць, з першых вуснаў чуць пра многія рэчы. Сам Клаўдзій Сцяпанавіч перажываў, што не атрымаў падтрымку варыянт з арнаментам — ён вельмі хацеў дадаць сцягу нацыянальны каларыт...

Але я хачу трохі прызямліць нашу гутарку да рэальнасці. Апошнім часам ідзе нямала размоў пра гісторыю сцяга, пра тое, кім, як і калі ён ствараўся, дзе і як яго выкарыстоўваць. Тут, мне здаецца, мае месца падмена паняццяў. Разважаючы такім чынам пра сцяг, многія не заўважаюць, што ўжо маюць на ўвазе не сцяг, а падзеі, якія пад ім адбываліся. Сам па сабе сцяг не страляе, не забівае людзей, гэта проста сцяг, як і тая ж свастыка, якая, як ужо гаварылі, была на працягу стагоддзяў сімвалам сонца. Але, як толькі яна перайшла ў катэгорыю фашызму — ніякая старажытная пазітыўная сімволіка не перакрые тыя злачынствы, што здзяйснялі пад гэтым сцягам гітлераўцы.

На жаль, наш бчб-сцяг таксама вельмі моцна прывязаны да жудасных падзей, якія чыніліся на гэтай зямлі ў вайну. Яго ўжыванне звязана з акупацыйным рэжымам, з калабарантамі. І тым, хто спрабуе калабарантаў нейкім чынам апраўдаць, варта нагадаць, што на Нюрнбергскім працэсе дзейнасць калабарантаў была прызнаная злачыннай. Атрымліваецца, што пад гэтым сцягам прымалі прысягу на вернасць фашызму, здзяйсняліся злачынствы адносна беларускага народа. Гэты сцяг непарыўна прывязаны да тых падзей, яго выкарыстоўвалі, укладаючы ў гэта пэўны сэнс...

***«ЗВЯЗДА»: Так, тэма мінулай вайны — краевугольны камень у адносінах для бчб-сцяга, які задумваўся ў 1917 годзе з самымі лепшымі меркаваннямі і памкненнямі — як сімвал маладой нацыі...***


Ігар МАРЗАЛЮК.


Вадзім ГІГІН.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** А зараз руплівцы бчб стараюцца вышморгваць толькі тыя факты, якія падмацоўваюць патрэбны ім кантэнт. Цытуюць, напрыклад, маладога Максіма Танка, які ўслаўляў гэты сцяг. Але, калі мы гаворым пра гісторыю, давайце казаць пра ўсё, як было на самай справе. Так, безумоўна бел-чырвона-белы сцяг прысутнічаў як сімвал на першым Усебеларускім з'ездзе. Так, і з гэтым ніхто не спрачаецца, яго стваральнік Клаўдзій Дуж-Душэўскі быў найпрыстойнейшым чалавекам, які ў вайну ратаваў яўрэяў. Але прычым тут ён да таго, як выкарысталі ў вайну яго дзецішча?

Так склалася для бчб-сцяга, што самы страшны, самы ганебны перыяд у яго невялікай гісторыі — гэта фашысцкая акупацыя. Тут трэба мець на ўвазе яшчэ і тое, што досвед той вайны ўнікальны ў кожнага народа. Для беларусаў, бадай, больш, чым для іншых — гэта калектыўная траўма. Нават сёння, калі беларус любога ўзросту кажа «вайна», яму не трэба ўдакладняць, якая менавіта. Таму ў нас, можна сказаць, сакральнае стаўленне да 3 ліпеня і 9 мая. І ўсё, што звязана са злачынствамі той вайны, успрымаецца як асабісты боль.

Тут яшчэ вось які момант. Дзе людзі бачылі бчб-сцяг — як сцяг БНР (якую правільна назваць беларускім палітычным праектам, але ніяк не незалежнай дзяржавай, бо праект не ўдаўся)? У Мінску, у Слуцку, у Гародні. На ўсходзе Беларусі — у Оршы, Віцебску яго ўвогуле не было, там жа ў 1918-м лінія фронту праходзіла. І атрымліваецца, што жыхары значнай часткі сённяшняй Беларусі ўпершыню ўбачылі гэты сцяг менавіта падчас Вялікай Айчыннай, побач з гітлераўскім, над галовамі калабарантаў. І гэта таксама гістарычны факт, вядомы, але некаторым нязручны, таму замоўчваецца.

Цяпер некаторыя гісторыкі спрабуюць сцвярджаць, што бчб-сцяг быў забаронены акупацыйным рэжымам у 1942—1944 гадах. Няхай бы пачыталі работы тагачасных нямецкіх геральдыстаў, у якіх усё распісана, калі і дзе можа ўжывацца гэтая сімволіка на акупаванай тэрыторыі. Давайце не будзем хлусіць сабе і іншым, што гэты сцяг пры фашыстах выкарыстоўваўся толькі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# І ІХНІЯ СІМВАЛЫ

## іграе ў жыцці краіны і грамадства



Сяргей ТРАЦЦЯК.



Алег ДЗЯРНОВІЧ.



Наталля ГОЛУБЕВА.

ў рытуальных мэтах і ў неваенізаваных фарміраваннях. У 1943 годзе Гімлерам быў зацверджаны шаўрон, які нашываўся на форму ўсіх добраахвотнікаў асобных беларускіх рот СС. І на шаўроне гэтай формы быў «бела-чырвона-белы шчыток з залатым ярылавым крыжам» — гэтаму ёсць дакументальныя пацвярджэнні. І давайце не будзем маўчаць пра тое, што ўдзел усіх трыццаці шасці батальёнаў Беларускай краёвай абароны, якія афіцыйна хадзілі пад бчб-сцягам, у карнай аперацыі «Кармаран», якая ў маі-чэрвені 1944 года праводзілася фашыстамі на ўсходзе Беларусі — таксама дакументальна пацверджаны факт. Палілі вёскі, забівалі тых, чые сваякі былі ў партызанах. Беларусы забівалі беларусаў, і пра гэта таксама не трэба маўчаць... У Нацыянальнай бібліятэцы захоўваюцца лістоўкі партызанскага атрада «Жалязняк» са зваротам-пытаннем да членаў БКА: «Як вы можаце забіваць сваіх?»

***«ЗВЯЗДА»: І тым не менш менавіта гэты сцяг зрабілі ў 1991 годзе дзяржаўным. Няўжо тыя, хто прымаў гэтае рашэнне, не ведалі яго гісторыю?***

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Пра бел-чырвона-белы сцяг сапраўды многія не ведалі ў савецкі час, а хто ведаў — маўчалі, каб не пацярпець за «прапаганду нацыяналізму»...

**Наталля ГОЛУБЕВА:** Давайце ўзгадаем, як гэта было ў 1991-м (маладыя людзі, якія сёння лічаць бчб-сцяг ледзь не святыняй, гэтага не памятаюць і, думаю, не ведаюць). Апаненты цяпер кажуць: маўляў, тады камуністы, ведаючы, што гэты сцяг заплямлены злачынствамі падчас вайны, яго б нават блізка не дапусцілі як дзяржаўны сімвал. Я тады як супрацоўнік Апарату ўрада адказвала за ўзаемадзеянне з парламентам, прысутнічала на ўсіх пасяджэннях Вярхоўнага Савета, падчас якіх абмяркоўвалася пытанне сімволікі. Камуністы не мелі тады вырашальнага голасу — на хвалі развалу Саюза ішло іх шальмаванне. Да таго ж вельмі моцна ў той час гучала ідэя дамінавання тытульнай нацыі — а гэты сімвал бачыўся менавіта нацыянальным. Таму супрацьстаянне ідэі надаць бчб-сцягу афіцыйны дзяржаўны статус у парламенце было на той момант вельмі слабое. Але ж у самім грамадстве гэта супрацьстаянне нарастала. Пытанне аб сімволіцы, вынесенае ў 1995 годзе на рэферэндум, не ўзялося з нікуль. Прэзідэнт выконваў абяцанне, дадзенае сваім выбаршчыкам. І пераважная большасць людзей, якія на рэферэндум прыйшлі, сімволіку, звязаную з ваеннымі злачынствамі, проста адхілілі. І гэта ўжо гістарычны факт.

**Вадзім ГІГІН:** Трэба ўлічваць, у якой сітуацыі 19 верасня 1991 года прымалі рашэнне аб дзяржаўнай сімволіцы. Калі сёння хтосьці сцвярджае, што тады праводзілася маштабнае даследаванне, — яму паверыць хіба што той, хто не жыў у той час. Быў сумбур, была разгубленасць, і тыя дэпутаты, якія ў жніўні прагаласавалі за забарону Камуністычнай партыі і камсамола, маглі прымаць розныя рашэнні. Але хутка — і пра гэта сведчаць і СМІ таго часу, і дакументы, у грамадстве менавіта з нагоды сімволікі разгаралася дыскусія. І зразумела, што малады Прэзідэнт Лукашэнка не выносіў бы гэтае пытанне на рэферэндум, калі б не бачыў народнай падтрымкі.

Не ўсе ведаюць, што напярэдадні рэферэндуму разглядаліся розныя варыянты дзяржаўнага сцяга, альтэрнатыўныя бчб. Але яны ўсе так ці інакш былі звязаны з трансфармацыяй сцяга БССР, прынятага ў 1951 годзе.

Трэба сказаць, што пытанне сімволікі пасля развалу СССР стала і перад іншымі незалежнымі дзяржавамі постсавецкай прасторы. Кожная праходзіла гэты шлях па-свойму. Цікавы прыклад Расіі, дзе знайшлі свайго роду ідэалагічны кампраміс: герб і сцяг вярнулі дарэвалюцыйныя, а гімн пакінулі савецкі, прычым новыя словы да яго напісаў той жа Сяргей Міхалкоў, аўтар слоў гімна СССР. Грузія пасля атрымання незалежнасці спачатку зрабіла дзяржаўным сцяг дэмакратычнай рэспублікі ўзору 1918 года, а ў 2004-м гэта даволі змрочных колераў палатно замянілі на яркі сцяг Святога Георгія, які выкарыстоўваўся яшчэ ў XIII стагоддзі...

Беларусь жа пайшла шляхам усенароднага галасавання. Дарэчы, пасля рэферэндуму 1995 года ўсе без выключэння — нават апошнія — сацыялагічныя даныя, прычым не толькі дзяржаўных структур, але і апазіцыйных, сведчаць пра тое, што ў грамадстве прыхільнікаў сённяшняга дзяржаўнага сцяга нашмат больш, чым у бчб. І нават на пытанне: якая сімволіка найбольш адпавядае гісторыка-культурнай традыцыі (не проста «падабаецца», а менавіта на такое пытанне трэба было адказаць) у адказах усіх узроставых катэгорый рэспандэнтаў пераважае дзяржаўная сімволіка.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** У 2018 годзе было праведзена апытанне «Аналітычнай майстэрняй» з Варшавы. Аказалася, што тых, хто хоча змяніць у Беларусі дзяржаўную сімволіку, — мізэрная меншасць. Калі ў 1995 годзе за бчб-сцяг прагаласавалі больш за 20 працэнтаў удзельнікаў рэферэндуму, дык тых, хто падтрымліваў яго ў 2018-м, паводле апытання, было каля трынаццаці працэнтаў... (Самае цікавае, што на іхнім сайце гэтыя вынікі ўжо падчышчаныя.)

***«ЗВЯЗДА»: Тым не менш сёння бчб-сцяг стаў сімвалам тых, хто адносіць сябе да пратэстоўцаў. Чалавек можа нават не выходзіць з ім на вуліцу, але павесіць гэты сцяг у сябе ў кватэры і будзе ўпэўнены, што мае рацыю. І гэта, па сутнасці, таксама адзін з момантаў канфлікту ў грамадстве... І забарона тут бачыцца не самым эфектыўным спосабам вырашэння гэтага канфлікту...***

**Алег ДЗЯРНОВІЧ:** Каб не ўносіць раскол у грамадства, вельмі важна выбраць правільны варыянт суіснавання сімволік. І трэба ўсе старонкі гісторыі паказваць.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Прычым паказваць не выбарачна, а сумленна, так, як яно было насамрэч. Мы мусім паказваць усё. Гістарычная памяць не можа будавацца на адвольнай выбарцы фактаў.

Зразумела, «рознакаляровае» (адносна сімволікі) грамадства трэба неяк кансалідаваць. Але, на жаль, нашы апаненты бачаць паразуменне толькі ў выглядзе здачы нашых пазіцый. Добра, калі вы кажаце, што з 1995 года сітуацыя кардынальна змянілася, і тых, хто падтрымлівае дзяржаўную сімволіку, 3 працэнты, а тых, хто за бчб — 97, — прадэманструйце цывілізаваную сілу ў рэчышчы канструктыўных працэсаў. Стварыце аргкамітэт, ідзіце збірайце подпісы. Прынясіце іх у Цэнтрвыбаркам — 450 тысяч, а лепш — мільён — і будзе рэферэндум. А самае галоўнае — здзейсніце сімвалічны акт. Скажыце, што вы ведаеце пра тое, што пасля настаўніцкага з'езда ў канцы 1941 года было прадпісана ў кожнай школе вешаць партрэт фюрара і бчб-сцягі па баках, і што гэта ганебная старонка ў гісторыі сцяга. Скажыце, што Франц Кушаль і Наталля Арсеннева, якія спалі ў акупаваным Мінску на пярынах забітых яўрэяў, — не вашы героі. Скажыце, што вы не апраўдваеце Станіслава Станкевіча, Радаслава Астроўскага, якія падчас вайны хадзілі пад гэтым сцягам. Што Янка Філістовіч, які ў складзе 13-га батальёна СД знішчаў яўрэяў у Глыбоцкім гета — асабіста расстраляў 120 патронаў (і быў за тое ўзнагароджаны водпускам да сям'і), — таксама не ваш герой. Што вы ведаеце пра Юрку Віцьбіча не толькі як пра «нацыянальнага дзеяча», а і як пра таго, хто ў перыядычным друку называў яўрэяў «ракавай пухлінай» і збіраў па іх апусцелых кватэрах карціны мастакоў віцебскай школы, а пасля вайны прадаваў у Амерыцы, — і ён таксама не ваш герой. Давайце будзем сумленнымі да канца.

І давайце яшчэ гаварыць пра працяг традыцыі існавання бчб-сімволікі ў сучаснасці. Што, толькі «воины света» пад ёй выходзяць? А пад якім сцягам ужо не адзін год існуе беларуская нацысцкая культура — «Камаедзіца», «Молат»...? Можна сказаць, што гэта культура маргінэзу, але ж менавіта гэты маргінэз быў у першых шэрагах падчас масавых беспарадкаў у пачатку жніўня. А радыкальная частка незарэгістраванага «Маладога фронту» — «Ваяр»? А «беларутэны»-нацысты, накшталт Громава з Віцебска, якога затрымалі ў 2016 годзе?

**Вадзім ГІГІН:** Прыхільнікі бчб-сцяга цяпер актыўна сцвярджаюць, што яго не выкарыстоўвалі ваенныя калабарацыяністы і паліцаі. Але ж дагэтуль цягам трыццаці гадоў яны таго не адмаўлялі і не саромеліся гэтага. Падраздзяленні пад камандаваннем Кушаля і Рагулі рабіліся ў іх ледзь не героямі. Нават з'явіліся сучасныя рэканструкцыі ўжо згаданага батальёна СД — і таму ёсць пацверджанне на фота, і ёсць імёны тых, хто ў іх удзельнічаў.

**Наталля ГОЛУБЕВА:** Мы павінны звяртацца і да рэальнасці сённяшняга часу, калі пад бчб-сцягам працягнулася традыцыя агрэсіўнасці. Трэба разумець, што сімволіка — гэта сур'ёзная рэч, калі размова ідзе пра абвастрэнне палітычнай сітуацыі. Яна выкарыстоўваецца, калі трэба падагрэць канфлікт, разгайдаць грамадства. І таму чакаць, пакуль усё супакоіцца, не варта... Цяпер трэба кінуць максімальныя сілы, каб данесці людзям усю праўду пра сімволіку, якую сёння выкарыстоўваюць у пратэсных акцыях.

Нам усе гэтыя факты трэба тлумачыць і расказваць людзям на ўсіх узроўнях, пачынаючы са школы. За часы існавання незалежнай краіны з-за нашай славутай талерантнасці, у тым ліку і да ўласнай гісторыі, кожны пачаў трактаваць яе па-свойму. Летась, здымаючы фільм пра дасягненні ў сферы культуры за гады незалежнасці, папрасілі вучняў адной школы вывучыць вершы пра Беларусь. І першы верш, які пачулі ад дзяцей, — верш Ларысы Геніюш. Верш, канешне, добры, таленавіты, але давайце тады казаць і пра іншы падпісаны гэтай аўтаркай дакумент — заклік збіраць грошы «на падтрымку непераможнай нямецкай арміі, у славу Гітлера». Ён ляжыць у архіве, у адкрытым доступе. А хто пра гэта ведае, хто гэтым цікавіцца? Тое ж можна сказаць і пра выкарыстанне сімволікі. Толькі валодаючы поўнай інфармацыяй, чалавек здольны рабіць свае высновы і свой выбар. І менавіта прадстаўленне такой інфармацыі — сёння адна з галоўных задач. Вельмі важна дакументы, якіх хапае ў архівах, максімальна адкрыць для шырокай грамадскасці.

**Вадзім ГІГІН:** Ёсць розныя формы і градус адносін да канфліктнай сімволікі. Ёсць сімволіка непажаданая — калі чалавек, які яе выкарыстоўвае, атрымлівае грамадскае асуджэнне. Ёсць забарона выкарыстоўваць пэўную сімволіку ў пэўных сітуацыях — знакаміты спіс непажаданай сімволікі на футбольных матчах. Наступны варыянт — забарона на выкарыстанне і штраф у якасці пакарання. І варыянт самы жорсткі — забарона і пазбаўленне волі на пэўны тэрмін. У сучаснай практыцы гэты варыянт дзейнічае ў некаторых краінах адносна нацысцкай сімволікі. А ўвогуле яна забароненая фактычна ва ўсім свеце, і гэта ўнікальны выпадак. Нават тыя краіны, у якіх выява свастыкі лічыцца часткай традыцыйнай культуры (напрыклад, Індыя) сёння адмовіліся ад яе выкарыстання, прынамсі публічнага...

**Ігар МАРЗАЛЮК:** За кожным сцягам ёсць гісторыя. За кожным сцягам стаяць пэўныя асацыяцыі. У сённяшняга дзяржаўнага сцяга гэта сацыяльная дзяржава, апеляцыя да славянскай еднасці...

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Але хто пра гэта гаворыць, хто гэта ведае? Трэба сапраўды весці вялікую адукацыйную работу. Бо даходзіць да таго, што баронячы дзяржаўную сімволіку, нават вельмі адукаваныя людзі гавораць аб тым, што пад гэтым сцягам мы перамаглі ў вайне, увайшлі ў ААН. А сцяг — калі мець на ўвазе той сцяг БССР, які стаў асновай для сённяшняга, быў зацверджаны ў 1951 годзе, калі і перамога, і членства ў ААН ужо адбыліся...

**Вадзім ГІГІН:** Любы палітычны крызіс у сучасным свеце мае сваё эмацыянальнае аздабленне, у тым ліку і сімвалы — сцягі, лозунгі, песні. І ў сённяшняй сітуацыі прызнаць бчб-сцяг гісторыка-культурнай каштоўнасцю, як прапануюць некаторыя, вельмі праблематычна. Але тут яшчэ варта гаварыць пра іншае. Крытыкуючы бчб-сцяг, мы пакуль яшчэ мала папулярызуем сцяг дзяржаўны. А насамрэч кожны грамадзянін краіны з пачатковых класаў павінен ведаць, што сімвалізуе гэты сцяг, адкуль на ім арнамент, што ў ім зашыфравана. У нас ёсць свята — Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Але ці адзначалі мы яго як належыць? Чаму ў нас усе дзяржаўныя чыноўнікі не ходзяць з маленькім сцяжком на лацкане пінжака, як гэта робіць Прэзідэнт? Да нядаўняга часу чалавек не мог вывесіць дзяржаўны сцяг у сябе на доме, не парушыўшы закон. Гэта нейкая сарамлівасць у выкарыстанні дзяржаўнай сімволікі адыграла сваю ролю ў згаданым крызісе...

**Алег ДЗЯРНОВІЧ:** Што ўжо казаць пра рэгіянальную афіцыйную сімволіку. А яна ў нас някепская, цікавая. Над ёй вельмі добра папрацавалі геральдысты. Але нават у сваіх рэгіёнах яе і пра яе мала ведаюць... Тут, дарэчы, варта заўважыць, што назва герба «Пагоня», якая выкарыстоўваецца на многіх рэгіянальных гербах сучаснай Беларусі, мае беларускае паходжанне. Пра гэта сведчыць прывілей караля і вялікага князя Ягайлы 1387 года, дзе апісвалася ўсеагульная воінская павіннасць. Тэкст дакумента быў напісаны на лаціне, звычай жа ўсеагульнай мабілізацыі быў названы «Пагоняй» — так і запісана, без перакладу, толькі лацінскімі літарамі. У далейшым адбылося перанясенне назвы воінскай павіннасці на назву герба. У тым ліку таму наша рэгіянальная сімволіка мае сапраўды глыбокую традыцыю.

**Ігар МАРЗАЛЮК:** Мы не павінны кідацца адно на аднаго з-за сімволікі, але павінны найперш ведаць аб'ектыўную праўду аб яе выкарыстанні ва ўсе перыяды яе існавання. І гэта на сёння галоўнае.

**Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

**Уважаемые акционеры!**

***Во исполнение решения внеочередного общего Собрания акционеров, состоявшегося 19.03.2021 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5,***

# ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»

(сокращенное наименование – ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»)

# ДОВОДИТ ДО ВАШЕГО СВЕДЕНИЯ СЛЕДУЮЩУЮ ИНФОРМАЦИЮ

Внеочередным общим Собранием акционеров принято решение об увеличении уставного фонда ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» до 708 630,00 белорусских рублей путем эмиссии дополнительного выпуска простых (обыкновенных) акций в количестве 130 436 штук номинальной стоимостью 4,60 белорусских рублей каждая на общую сумму 600 005,60 белорусских рублей, размещаемых путем проведения закрытой подписки.

Внеочередным общим Собранием акционеров утверждены следующие Условия проведения закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»:

1. Планируемый объем дополнительного выпуска акций – 600 005 белорусских рублей 60 копеек.

2. Количество и категория акций дополнительного выпуска – 130 436 простых (обыкновенных) акций.

3. Номинальная стоимость акции: 4 белорусских рубля 60 копеек;

4. Простые (обыкновенные) акции, выпускаемые в результате закрытой подписки, удостоверяют тот же объем прав их владельцев, что и простые (обыкновенные) акции, выпущенные ранее:

- получать часть прибыли Общества в виде дивидендов;
- получать в случае ликвидации Общества часть имущества, оставшегося после расчетов с кредиторами, или его стоимость;
- участвовать в общем собрании акционеров с правом голоса по вопросам, относящимся к компетенции этого собрания;
- получать информацию о деятельности Общества и знакомиться с его документацией в объеме и порядке, установленными настоящим уставом;
- распоряжаться принадлежащими им акциями в порядке, предусмотренном законодательством;
- избирать и быть избранными в органы управления Общества в порядке, предусмотренном законодательством и настоящим уставом;
- передавать свои полномочия по участию в управлении деятельностью Общества иным лицам путем выдачи доверенности либо заключения договора в порядке, установленном законодательными актами.

Акционеры ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» имеют другие права, предусмотренные законодательством, Уставом ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», локальными правовыми актами ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» и решениями общего собрания акционеров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».

Согласно Уставу ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» решением общего собрания акционеров может быть предоставлено акционерам Общества, владеющим простыми (обыкновенными) акциями, преимущественное право на приобретение дополнительно выпущенных Обществом акций и утвержден порядок реализации такого права.

5. Привилегированные акции при проведении данной подписки не размещаются.

6. Планируемый уставный фонд после проведения подписки 708 630 рублей 00 копеек.

7. Цена подписки на одну простую (обыкновенную) акцию – 4 белорусских рубля 60 копеек.

8. Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям, в том числе и по вновь выпускаемым акциям дополнительного выпуска, определен уставом ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7». ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» вправе между акционерами – владельцами простых (обыкновенных) акций распределять, если иное не предусмотрено законодательством, настоящим уставом, часть прибыли, остающейся в его распоряжении после уплаты налогов и иных обязательных платежей и покрытия убытков текущих периодов, образовавшихся по вине ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», посредством выплаты дивидендов. В случаях и порядке, определенных законодательными актами, ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» обязано выплачивать дивиденды. Годовое Общее собрание акционеров вправе также при определении направлений распределения прибыли на период до следующего годового собрания принять решение о направлении ее части (в процентах) на выплату промежуточных дивидендов по итогам полугодия, квартала, месяца. В этом случае по окончании каждого соответствующего периода при наличии прибыли, достаточной для выплаты дивидендов, внеочередным собранием принимается решение об определении размера промежуточных дивидендов в белорусских рублях на одну акцию и срока их выплаты. Общее собрание акционеров устанавливает период, за который выплачиваются дивиденды, а также срок выплаты дивидендов. В случае если решением общего собрания акционеров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» срок выплаты дивидендов не определен, он не должен превышать 60 дней со дня принятия решения об объявлении и выплате дивидендов. Размер дивиденда объявляется в белорусских рублях на одну акцию. Дивиденды выплачиваются в денежных единицах Республики Беларусь, а по решению общего собрания акционеров и с согласия их получателей – в установленном порядке товаром или иным имуществом. Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составляется на основании данных того же реестра акционеров, на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, принявшем решение о выплате дивидендов. Информация о времени и месте выплаты дивидендов доводится до сведения акционеров в том же порядке, в котором они извещаются о проведении общего собрания акционеров. По заявлению акционера причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в банке. Расходы по пересылке (перечислению) дивидендов в пределах Республики Беларусь производятся за счет средств ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».

9. Способ размещения акций дополнительного выпуска – закрытая подписка. Зачисление акций на счета «депо» подписчиков производится не позднее 5 (пяти) рабочих дней с момента зачисления дополнительного выпуска акций на счет «депо» эмитента.

10. Перечень лиц, среди которых размещаются акции дополнительного выпуска: акционеры ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7». Списки акционеров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», среди которых размещаются акции дополнительного выпуска, составляется на основании данных того же реестра акционеров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, принявшем настоящее решение об увеличении уставного фонда ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» путем эмиссии акций дополнительного выпуска, размещаемых путем проведения закрытой подписки. Акционеры реализуют свое право покупки акций дополнительного выпуска путем заключения с ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» в порядке очередности их обращения в ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» договоров закрытой подписки на акции дополнительного выпуска.

11. Сведения о месте, дате и времени проведения размещения акций дополнительного выпуска: ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», 220005, г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 в период проведения закрытой подписки.

12. Период проведения закрытой подписки на акции дополнительного выпуска:

12.1. дата начала проведения закрытой подписки на акции дополнительного выпуска (дата начала заключения договоров закрытой подписки на акции дополнительного выпуска): 01.04.2021 г.

12.2. дата окончания проведения закрытой подписки на акции (дата окончания заключения договоров закрытой подписки на акции дополнительного выпуска): 09.04.2021 г.

13. Договоры закрытой подписки на акции дополнительного выпуска заключаются с лицами, среди которых размещаются акции дополнительного выпуска, в порядке очередности их обращения в ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» за заключением таких договоров.

14. Период сбора предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести акции: при проведении настоящей закрытой подписки на акции дополнительного выпуска период сбора предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести акции в ходе подписки, не устанавливается, а сам сбор предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести акции в ходе подписки, не осуществляется.

15. Порядок оплаты акций дополнительного выпуска, размещаемых путем проведения закрытой подписки: денежными средствами в безналичном порядке платежным поручением путем перечисления на текущий (расчетный) счет ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», указанный в договоре подписки, в период проведения закрытой подписки на акции. Оплата акций дополнительного выпуска, размещаемых путем проведения закрытой подписки, должна быть фактически произведена лицом, заключившим с ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» договор закрытой подписки, в полном объеме в период проведения закрытой подписки на акции.

16. Порядок действий эмитента в случае превышения планируемого объема дополнительного выпуска акций: превышение планируемого объема дополнительного выпуска акций, указанного в пункте 1 настоящих условий, и превышение количества акций, размещаемых путем проведения закрытой подписки, указанных в пункте 2 настоящих условий, не допускается.

17. Порядок действий эмитента в случае недостижения планируемого объема дополнительного выпуска акций: в случае если планируемый объем дополнительного выпуска акций, указанный в пункте 1 настоящих условий, в период проведения подписки, указанный в пункте 12 настоящих условий, не будет достигнут, но при этом в указанный период лицами (лицом), среди которых размещаются акции дополнительного выпуска, будут внесены вклады в уставный фонд ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», то общее собрание акционеров вправе принять одно из решений:

- утвердить фактические результаты размещения дополнительного выпуска акций, решение о дополнительном выпуске акций и изменения в Устав ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», связанные с увеличением уставного фонда на сумму номинальных стоимостей фактически размещенных акций дополнительного выпуска;
- о продлении срока закрытой подписки на акции дополнительного выпуска.

18. Условия отказа от заключения договора подписки:

- лицо, обратившееся за заключением договора подписки, не включено в перечень лиц, среди которых размещаются акции дополнительного выпуска;
- акционер ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», обратившийся за заключением договора подписки, не включен в список акционеров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», среди которых размещаются акции дополнительного выпуска;
- ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» заключены договоры подписки на все количество акций, размещаемых путем проведения закрытой подписки, указанных в пункте 2 настоящих условий;
- истек срок проведения подписки, указанный в пункте 12 настоящих условий;
- эмиссия акций дополнительного выпуска приостановлена или запрещена;
- имеются иные основания, предусмотренные действующим законодательством Республики Беларусь, Уставом ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», локальными правовыми актами ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» или настоящими условиями.

19. Условия досрочного прекращения проведения закрытой подписки на акции: подписка прекращается досрочно при внесении акционерами (акционером), заключившими договоры подписки, в уставный фонд вкладов (вклада) на сумму планируемого объема дополнительного выпуска акций, указанного в пункте 1 настоящих условий.

20. Основания, по которым эмиссия акций может быть признана несостоявшейся: эмиссия акций признается несостоявшейся при наличии любого из следующих оснований:

- в период проведения подписки на акции между ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» и лицами, среди которых размещаются акции дополнительного выпуска, не было заключено ни одного договора подписки;
- в период проведения подписки на акции ни одним из лиц, заключивших с ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» договоры подписки, не были внесены вклады в уставный фонд ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» для оплаты акций.

Доля неразмещенных (неоплаченных) акций, при которой эмиссия акций считается несостоявшейся, составляет 80 % (104 350 штук).

21. Условия и порядок возврата средств инвесторам в случае признания дополнительного выпуска акций недействительным или эмиссии акций несостоявшейся, а также в случае запрещения эмиссии:

- средства, полученные ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» от размещения дополнительного выпуска акций, признанного недействительным или эмиссия которого признана несостоявшейся или запрещена, в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты признания дополнительного выпуска акций недействительным или эмиссии акций несостоявшейся, запрещения эмиссии акций возвращаются инвесторам;
- возврат средств инвестору осуществляется безналичными денежными средствами и в той же валюте, в которой инвестором оплачивались акции.

***Директор***
***ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»***

УНП 100088916

---

УВЕДОМЛЕНИЕ

**Наблюдательный совет**

## ОАО «УНИВЕРСАМ РИГА»

**сообщает о проведении внеочередного Общего собрания акционеров, которое состоится 20 апреля 2021 года в 13.00 со следующей повесткой дня:**

1. О внесении изменений в крупную сделку с ОАО «БНБ-Банк».
2. Об утверждении стоимости недвижимого имущества, передаваемого в залог ОАО «БНБ-Банк».
3. О наделении полномочиями директора ОАО «УНИВЕРСАМ РИГА» Сушкевич Ларису Францевну на подписание соответствующего дополнительного соглашения.

Собрание состоится по адресу:
**г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «РИГА».**

Регистрация акционеров (их представителей) будет проводиться в день собрания с 12.30 до 13.00.

При регистрации акционеры обязаны предъявить документ, удостоверяющий личность; представитель акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

*Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»*

УНП 100299678

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Весейский Покров» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ КОНЮШНИ

**с инв. № 640/С-108786 общей площадью 553,3 кв. м, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 624681300001000012 площадью 0,4901 га *(право постоянного пользования)* по адресу: Минская область, Слуцкий район, Весейский с/с, 8,87 м от д. Набушево, ул. А.В. Бахтова, 1.**

*Земельный участок имеет ограничения прав на земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, пл. 0, 0970 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 9 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 900,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **22.04.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.04.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (01795) 48 2 57, 029 164 31 61.**

УНП 600043258

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Горняк» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ БАНИ

**площадью 180,0 кв. м, инв. № 644/С-53302, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625085402601000351 (право аренды по 17.11.2034) площадью 0,0617 га, по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, аг. Жабин, ул. Юбилейная, 8А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **35 895,02** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 20 %* (задаток 10 % от начальной цены – **3 589,50** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» 14.08.2020, 16.10.2020.

Аукцион состоится **08.04.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.04.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра 8 (044) 783 82 52.**

УНП 600071102

---

УНП 400051678

## ОАО «ОРС ГОМЕЛЬ»

**ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ НАЗНАЧЕННЫХ НА 24 МАРТА 2021 г.**

| |
|---|
| **Продавец – ОАО «ОРС Гомель».**<br>**Оператор – «Единая система электронных торгов» torgi.gov.by** |
| **Предмет электронных торгов и его месторасположение** |
| **Лот № 1. Капитальное строение – здание магазина № 88,** инв. номер 320/С-26581, общая площадь 288,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Жлобин, ул. Ленинградская, 14 (магазин № 88) (с принадлежностями к зданию).<br>**Лот № 2. Капитальное строение – здание ресторана с подвалом,** инв. № 320/С-19142, расположенное по адресу: г. Жлобин, пл. Привокзальная, общая площадь 1158,2 кв. м (с принадлежностями к зданию) |
| Полный текст извещения о проведении электронных торгов опубликован в газете «Звязда» от 11.03.2021 № 45 (29414). Подробную информацию можно получить по тел.: +37529 6672143; +37529 6019210 |

# ПАДЗЕІ СТАЛІЦЫ — ПАДЗЕІ КРАІНЫ

## Агенцтву «Мінск-навіны» — 20 гадоў

**У яго склад зараз уваходзяць інфармацыйнае агенцтва з парталам Minsknews.by, газеты «Вечерний Минск», «Минский курьер», «Радыё-Мінск» і дзіцячы часопіс «Качели».**
**Партал агенцтва Minsknews з'яўляецца адным з самых буйных у краіне сярод дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў і ўпэўнена лідзіруе па наведвальнасці сярод сталічных медыя — сярэднямесячная колькасць унікальных візітаў перавышае тры мільёны, штодня матэрыялы чытае каля ста тысяч карыстальнікаў. Агенцтва было створана у сакавіку 2001 года, адпаведна, сёлета ўжо 20 гадоў, як яно максімальна поўна і аператыўна інфармуе аб падзеях, якія адбываюцца ў беларускай сталіцы, а дакладней, у эканамічнай, сацыяльнай, культурнай сферах жыццядзейнасці і іншым. Як заваяваць любоў і давер карыстальнікаў інтэрнэт-асяроддзя? Каб пачуць адказ на гэта і іншыя пытанні, мы сустрэліся з намеснікам генеральнага дырэктара холдынга Дзмітрыем ПАРТОНАМ.**

***— У рабоце з навінамі ёсць пэўная асаблівасць — гэта вялікая колькасць рознабаковай інфармацыі, якая праходзіць праз вас. Як з усім гэтым не ўпусціць галоўнае?***

— Любая падзея ў межах сталіцы — гэта так ці інакш падзея краіны, таму трэба заўсёды быць «на хвалі» і заўважаць самае цікавае. Для нас значнымі з'яўляюцца тыя навіны, якія цікавыя мінчанам, гэта можа быць як інфармацыя пра рамонт дарогі і пасадку дрэў, так і агульнарэспубліканскія падзеі. У 2018 годзе мы пачалі развівацца ў інавацыйным фармаце гарадскога мультымедыйнага партала, у аснову якога пакладзена канвергентная работа журналістаў. У нас няма асобнага штату супрацоўнікаў таго ці іншага выдання, усе яны — універсальныя. Калі на момант стварэння агенцтва акцэнт быў зроблены на друкаваныя СМІ, то цяпер асноўным з'яўляецца партал. Мы ўсведамляем, што нас чытаюць не толькі ў Беларусі, але і ў суседніх краінах. Штодзень мы публікуем прыблізна 150 навін рознай накіраванасці. Шэраг журналісцкіх матэрыялаў — аўтарскія праекты. Мы часам думаем, што людзі сталі залішне палітызаваныя і іх цікавіць менавіта такая тэма, але гэта далёка не так. Адкрыццё новых школ, пачатак работы паліклінік, змена рэжыму работы транспарту, праграмы па азеляненні сталіцы — усё гэта выклікае вялікую цікавасць у нашых чытачоў. Часам паведамленне пра адкрыццё новага трамвайнага маршруту збірае больш праглядаў, чым навіна з шоу-бізнесу.

***— Якія рубрыкі, тэмы з'яўляюцца прыярытэтнымі на партале агенцтва?***

— Значная частка навін прысвечана канкрэтнай рабоце ўладаў горада, камунальных службаў, гандлю, гарадскога транспарту, устаноў адукацыі і аховы здароўя. Усё гэта ўплывае на паказчыкі павелічэння лаяльнай аўдыторыі, глыбіні і часу прагляду. Ёсць шэраг раздзелаў і рубрык, якія асвятляюць гэта, і яны вельмі папулярныя. Напрыклад, у рамках раздзела «Прыміце меры» да нас звяртаюцца з пэўнымі скаргамі, мы просім у спецыялістаў разабрацца і пішам аб гэтым. У іншай пад назвай «Пыталіся — адказваем» да нас нярэдка звяртаюцца з просьбай дапамагчы разабрацца ў розных сітуацыях, якія датычацца пенсій, дапамог, сямейнага капіталу. Пытанняў шмат, і яны вельмі актуальныя.



Кампетэнтныя спецыялісты на іх хутка адказваюць. Ёсць мультымедыйны аддзел, які займаецца відэаздымкамі. Я вяду праграму «Гаворыць і паказвае Мінск», там абмяркоўваем рознабаковыя тэмы: якія эксперыментальныя праекты рэалізуюцца ў паліклініках; чаму моладзь на сёння больш пытаецца, чым прапаноўвае; як фарміруецца бюджэт Мінска і гэтак далей. Таксама сумесна з Мінгарвыканкамам развіваем цікавы праект, які называецца «Задайце пытанне сталічным уладам», дзе эксперты адказваюць на пытанні нашых чытачоў у фармаце тэлеэфіру. Дарэчы, чыноўнікі адкрыта ўдзельнічаюць у нашых праграмах, адказваюць на вострыя пытанні, даюць каментарыі па розных кірунках. А яшчэ чытачам вельмі падабаюцца такія сюжэты, як «ПрафРынг», дзе нашы хлопцы-журналісты спрабуюць сябе ў «жаночых» прафесіях, а дзяўчаты — у «мужчынскіх».

На сайце агенцтва актыўна публікуюцца фотарэпартажы. Дзмітрый Партон упэўнены, што прафесія фотакарэспандэнта вельмі важная на сёння.

— Цяпер усё менш карыстальнікаў інтэрнэт-асяроддзя хочуць чытаць, а ўсё больш — глядзець. Іншае пытанне, што цяпер сыходзіць класічная фотажурналістыка з пастановачнымі кадрамі. Але нас вельмі радуе, калі фотакарэспандэнт і добра піша, і фатаграфуе. Тут пытанне ў стаўленні да сваёй справы. Калі журналіст бачыць якую-небудзь з'яву на вуліцы і адразу бяжыць яе здымаць, каб у восем гадзін раніцы гатовы матэрыял ужо быў апублікаваны на сайце, — гэта добры журналіст. І не важна, ёсць у яго прафесійная камера або не, — важна быць аператыўным. Са з'яўленнем гаджэтаў часам нават здымак на Iphone набірае шмат лайкаў і каментарыяў. Напрыклад, у нас ёсць сумесны праект са Следчым камітэтам — праграма «Прычыны і следства». Карысную інфармацыю на сайт мы даём з эфіру літаральна праз 20 секунд, — гэта добры паказчык прафесіяналізму.

Аб эфектыўнай рабоце агенцтва сведчаць лічбы. Калі яшчэ два гады таму партал «Мінск-навіны» штодзень наведвалі дзвеццаць тысяч карыстальнікаў, то цяпер — амаль у 30 разоў больш, а гэта звыш 100 тысяч унікальных карыстальнікаў.

— Як толькі сайт агенцтва стаў працаваць фактычна кругласутачна, з'явіліся добрыя вынікі і дасягненні. У нас высокі індэкс цытуемасці навін і партала (калі спасылаюцца на «Мінск-навіны»). Да таго ж цяпер многія атрымліваюць інфармацыю далёка не толькі з газеты і партала, таму для нас найважнейшым момантам з'яўляецца распаўсюджванне матэрыялаў і навін праз розныя каналы інфармацыі. На сёння ў нас іх каля дзясятка. Актыўна развіваем групы ў сацыяльных сетках: «Аднакласнікі», Facebook, «Укантакте», Twitter, Instagram, TikTok, Telegram-канал, Youtube-канал. Напрыклад, апошні з'явіўся прыкладна паўтара года таму, і цяпер там больш за шэсць тысяч пастаянных падпісчыкаў і больш за 2,5 мільёна праглядаў. Ёсць партнёрскія адносіны з Mail.ru Group, канал распаўсюджвання праз «Яндекс Дзэн». І гэта вельмі важна ў канкурэнтным інфармацыйным асяроддзі. Трэба імкнуцца прасоўваць сваю інфармацыю, заўсёды тэсціраваць нешта новае.

На пытанне, як заставацца паспяховым інфармацыйным агенцтвам у 2021 годзе і як вызначыць гэты паказчык поспеху, Дзмітрый Партон кажа, што самае галоўнае — гэта праўдзівасць, аператыўнасць, любоў да сваёй справы, адваротная сувязь з чытачамі, слухачамі, гледачамі.

— Ведаеце, зараз набірае абароты такі від журналістыкі, як рырайт. Хтосьці, не выходзячы са свайго кабінета, робіць трафік сайта, не хадзіўшы на мерапрыемствы, не сустракаючыся з цікавымі асобамі, а проста перарабляючы навіну «пад сябе». Спасылацца там няма на што, таму што ўся інфармацыя ўжо была аднекуль узятая, — мы супраць такога падыходу. Так, нам цікавая амаль любая інфармацыя, але абавязкова працуем з афіцыйнымі крыніцамі. А іх дзясяткі — ад афіцыйных інтэрнэт-рэсурсаў міністэрстваў, ведамстваў і нават прадпрыемстваў да тэлеграм-каналаў прэс-сакратароў праваахоўнага блока. Дапамагаем інфармацыйна Мінгарвыканкаму, сумесна вядзём тэлеграм-канал «Мінск. Афіцыйна», там зараз больш за шэсць тысяч падпісчыкаў. Для таго каб быць паспяховым інфармагенцтвам, трэба мець прафесійных журналістаў. Гэта наша самае галоўнае багацце. Мы заўсёды гатовыя браць да сябе новых супрацоўнікаў, але важна, каб у іх быў запал у вачах. Цяпер, мне здаецца, ёсць тэндэнцыя сярод некаторых маладых журналістаў: гэта павярхоўнае стаўленне да сваёй справы, непагружанасць у прафесію. Часам вельмі здзіўляе, калі дасылаюць сваё рэзюмэ на вакансію, але не працапаноўваюць ніводнай сваёй публікацыі. У нашай справе таксама важная хуткасць выканання. Можна вельмі доўга пісаць аб суседнім доме, дзе здарыўся пажар, але калі хтосьці апынуўся на месцы здарэння раней і ўзяў адтуль усю неабходную інфармацыю, ты «ў пралёце». Трэба быць зацікаўленым у сваёй прафесіі, а да гэтага і грошы прыкладуцца, і прызнанне.

**«Для таго каб быць паспяховым інфармагенцтвам, трэба мець прафесійных журналістаў. Гэта наша самае галоўнае багацце».**

***— З пачатку пандэміі людзі, здаецца, усё больш сталі сумаваць... Ці аддаяце ўвагу пазітыўным матэрыялам?***

— Так, мы бачым цікавасць да пазітыўных навін, аналітычных матэрыялаў сацыяльнай накіраванасці. Мы не хочам згушчаць фарбы, наадварот, расказваем, напрыклад, як пенсіянерка пайшла на танцы і яхія эмоцыі адчула, або пра сям'ю, дзе нарадзілася доўгачаканае дзіця. Больш за тое, на розных СМІ сустракаюцца так званыя «панічныя навіны», якія павяргаюць некаторых у шок, але збольшага яны ў сабе не нясуць ніякай праўдзівай інфармацыі. Мы разбіраемся з імі, аналізуем, тэлефануем спецыялістам, каб пацвердзіць або абвергнуць іх. Таму што ў пагоні за трафікам многія СМІ спрабуюць «выехаць» на рэзка негатыўных публікацыях, але мы не можам дазволіць сабе сапсаваць рэпутацыю дзеля клікбетнага загалоўка. Мы сталі першым гарадскім медыйным холдынгам у Беларусі дзякуючы яго першаму генеральнаму дырэктару Рыгору Новікаву, а надалей — дзякуючы генеральнаму дырэктару Юрыю Казіятку. Для нас важна быць цікавымі не толькі ў межах Мінска, але і ўсёй краіны. Перспектыву развіцця бачым у асваенні новых пляцовак, не трэба гэтага баяцца любому СМІ. Хочам пашыраць геаграфію прысутнасці нашых навін у інфармацыйнай прасторы, у тым ліку за кошт узаемадзеяння з замежнымі партнёрамі. Добра, што інтэрнэт не ведае граніц, але ў першую чаргу мы павінны быць карыснымі нашаму беларускаму чытачу. Любое СМІ, інфармагенцтва павінны быць наведвальнымі, цытуемымі, аўтарытэтнымі і мець лаяльную аўдыторыю. Усяго, што задумвалася на першым этапе, мы дасягнулі і ідзём далей, упэўненыя, што ў правільным кірунку.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Тамары ХАМІЦЭВІЧ, агенцтва «Мінск-навіны».**

Акцэнты

# НАС ПАДЗЯЛІЛІ ЧУЖАНІЦЫ...

**Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце правялі маштабную навуковую канферэнцыю, прысвечаную стагоддзю заключэння Рыжскага міру. Дзясяткі вучоных абмяркоўвалі пытанні, звязаныя з тым, якія перадумовы былі ў Савецка-польскай вайны і як заключэнне дадзенага пагаднення паўплывала на лёс беларускага народа.**

**Доктар гістарычных навук, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ** звярнуў увагу, што падчас даволі складанай геапалітычнай сітуацыі пасля заканчэння Першай сусветнай вайны не абышлося і без умяшальніцтва звонку ў справы, звязаныя з дзяржаваўтваральнымі працэсамі на мяжы былой Расійскай імперыі. Адсутнасць вопыту нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, недахоп нацыянальнай свядомасці кіраўнікоў і навыкаў палітычнай работы сярод беларускага насельніцтва не дазвалялі актывізаваць гэтыя працэсы. Не было адзінай стратэгіі дзеянняў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Бясспрэчна, усё гэта прывяло да трагедыі беларускага народа, пра якую Якуб Колас напісаў: «Нас падзялілі чужаніцы».

Як заўважыў у пачатку канферэнцыі **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ,** беларуская дзяржаўнасць — найстаражытнейшая ў Еўропе, і сёння неабходна не проста пра гэта больш гаварыць, але і адстойваць свае нацыянальныя інтарэсы. Таму пастаўлена задача аб умацаванні Інстытута гісторыі, яго пашырэнні і пераўтварэнні ў найбуйнейшы нацыянальны рэспубліканскі цэнтр, з асобнымі інстытутамі гісторыі, археалогіі, антрапалогіі.

Беларускаму народу давялося прайсці доўгі і складаны шлях для рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці ў складаных і супярэчлівых вонкава і ўнутрана палітычных абставінах. Да канца лета 1919 года тэрыторыя маладой рэспублікі (на той час БССР аб'яднаў з Літоўскай рэспублікай) была акупаваная польскімі войскамі. Баявыя дзеянні працягваліся амаль два гады і закончыліся падпісаннем Рыжскага мірнага дагавора. «Рыжскі дагавор з'яўляўся па сутнасці антыбеларускім, не адпавядаў нацыянальным інтарэсам беларускага народа, — заўважыў Уладзімір Гусакоў. — Нягледзячы на тое, што па ўмовах дадзенай дамовы беларусам былі гарантаваны нацыянальна-культурныя правы ў складзе Польскай дзяржавы, на практыцы рэалізацыя гэтых правоў не была забяспечана. Беларускім арганізацыям, якія займаліся культурнай і асветніцкай дзейнасцю, пастаянна даводзілася сутыкацца з супрацьдзеяннем з боку польскіх уладаў, а да 1939 года большасць гэтых арганізацый і беларускіх школ была ліквідавана».

Восенню 1939 года ў выніку вызваленчага паходу войскаў Чырвонай Арміі тэрыторыя Беларусі атрымала цэласнасць. 14 лістапада 1939 года на сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР быў зацверджаны закон аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Артыкул 2 закона паведамляў «прыняць Заходнюю Беларусь у склад Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і такім чынам аб'яднаць вялікі беларускі народ у адзіную беларускую дзяржаву».

Працяг тэмы — у аўтарак у «Ігуменскім тракце».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 8 (534)

## Пяць загадкавых любоўных вершаў беларускай паэзіі

Ёсць нагода

# «Ажыў я сэрцам — хочу браць: яна ж была... з камення»

**Напярэдадні Сусветнага дня паэзіі самы час пагаварыць пра яе загадкі.**

**Вядома ж, у вершы мусіць быць таямніца... Магія.**

**У XVII стагоддзі беларускія знахары лячылі зубны боль з дапамогай верша, лацінскага паліндрома «sator arepo tenet opera rotas». Як гучыць! Хоць гэта ўсяго толькі практыкаванне для шкаляроў — «магічны квадрат», па якім недарасці вучыліся слоўнай гульні. Бессэнсоўная фраза, якая перакладаецца як «Сейбіт Арэпа змушае колы круціцца». Урэшце, усе замовы — суцэльная паэзія... Таму і імкнуцца спрадвеку выказваць у вершах свае любоўныя перажыванні. Выліваць горыч здрады — «А яна, а яна была толькі дзяўчына», прызнавацца ў каханні — «Мне доўгае расстанне з вамі чарней ад вашых чорных кос»...**

**Давайце сёння ўспомнім пяць беларускіх вершаў, за якімі хаваюцца нечаканыя гісторыі кахання.**

## 1. ЗЛАВЕСНАЯ ЗОСЯ

### ЦЁМНАЯ КВЕТАЧКА

Я сэрцам спаў, а мысль мая
Па неба йшла палетку.
Аж раз калісь убачыў я
Прыгожу цёмну кветку.

Яна красою так, як больш
Там кветак, не зіяе,
А толькі чар яе нязгорш
Мой погляд прыцягае.

Ах, цёмна кветка! Буду рваць —
Мая ты! Цуд здарэння?!
Ажыў я сэрцам — хочу браць:
Яна ж была... з камення.

Якая гісторыя хаваецца за гэтым вершам паэта Гальяша Леўчыка?

У каханні яму не шанцавала. Дзяўчына, якую пакахаў у маладосці, была з занадта багатай сям'і... А ў 1932 годзе, калі паэту было больш за сорак, у адной варшаўскай газеце ён прачытаў абвестку, што ў Слонімскім павеце жыве дзяўчына, якая напісала аповесць па матывах беларускага жыцця, але на выданне няма сродкаў. Гальяш Леўчык тут жа напісаў таямнічай Зосі, спадзеючыся, што сустрэў родную душу. Зося аказалася не такой маладой — за трыццаць, беларускае пытанне яе не вельмі цікавіла. Але ўсё-ткі ажаніўся. Праз год піша сябру Яну Пятроўскаму:

«Ты прыпамінаеш мамэнт, што мог бы ты мне адрадзіць маё жаніцства, але гэта было б немагчыма, таму што ані ты, ані я яе не зналі, ні яе характару, ні здароўя, ані таго, што яна ёсць тыпам фаталісткі — хворым, зломым і збочаным умысловa... Пэўна, што і я, каб ведаў згары што будзе, — пэўна, што, не гледзячы нават на спачуцьцё да ейнага няшчасця і спагадання ёй, — не згадзіўся б ніколі на ахвяру свайго добрага становішча духовага, на сваю пазіцыю ў беларускім грамадстве і на пашану, якою дорыць мяне гэтае грамадзтва... бо гэта было б учынена для кабеты невялікае цаны...»

Зося ператварае жыццё мужа ў пекла. Здраджвае, прыводзіць у дом падазроных знаёмых, якія пагражаюць немаладому гаспадару. Сужэнцы жывуць на два дамы — у Варшаве і Слоніме. Калі пачалася вайна, Леўчык адправіўся са Слонімa да жонкі ў Варшаву, размінуўся — яна паехала да яго ў Слонім. Вярнуўся назад... За гэты час Зося прадала ягоны дом чужым людзям, якія былога гаспадара на ганак не пусцілі. Леўчык вярнуўся ў Варшаву, дзе памёр у 1944 годзе. Верш «Цёмная кветачка» быў знойдзены ў рукапісе зборніка «Беларускі жаўранак», які так і не выйшаў з друку.

## 2. ПАДСТУПНАЯ РЫМА

### Р. М.

Каханню нічога не трэба,
Каханне нічога не просе, —
Так радуе сіняе неба,
Так цешыць валошка ў калоссі.
Каханне, як песні пра зоры,
Лятункам заўсёды высока,
І шчасцем у свет, у прасторы
Каханкі расквітвае вока.
І нат у затоенай скрусе
Тваіх нераздзеленых пешчаў
К жалобе ніхто не прымусе
Надзею, што зрушана плешча.
Каханая, любая, квеце!
Ў палоне вясёлае долі
Ёсць песняй аб кім летуцеці,
І сэрцу даволі, даволі.
І сэрца бясхмарнае ясней
Схіляецца постаццю спелай,
Хоць сэрца яшчэ было б шчасней,
Каб дбаці аб кім яно мела.


Уладзімір ЖЫЛКА з жонкай Рымай МАНЕВІЧ.

Гэты цудоўны верш паэта Уладзіміра Жылкі быў надрукаваны ў 1928 годзе ў часопісе «Узвышша». Над творам — прысвячэнне «Р. М.».

Жылка толькі за два гады да публікацыі пераехаў у Савецкую Беларусь з Прагі. Спачатку знайшлася работа — у газеце «Звязда», а ў 1928-м на паэта ўжо нападаюць за тое, што «не набліжаецца да пралетарскай літаратуры». Выключаюць з «Маладняка», звальняюць са «Звязды». У Мінскім музычным тэхнікуме, дзе прапанаваў яму сваё месца выкладчыка паэт Язэп Пушча, Жылка пазнаёміўся са студэнткай Рымай Маневіч. Менавіта ёй і прысвечаны верш.

«Ведаеш, я закахаўся ўжо месяцаў са тры, і, здаецца, па самюсенькія вушы. Яна маленькая, рыжая і злюшчая, язычлівая. Мяне кахае» — прызнаваўся ў адным з лістоў паэт. Ён перастаў думаць нават пра сухоты, на якія сур'ёзна хварэў.

Жылка і Рыма ўзялі шлюб, нарадзілася дачка Беатрычэ, «Атачка»... А потым, улетку 1930-га, паэта арыштавалі — узялі проста з ложка, з высокай тэмпературай. Адправілі ў высылку ва Уржум. Рыма прыехала да мужа, але доўга не вытрымала: калі Жылка ў чарговы раз трапіў у бальніцу, дала свайі паводзінамі падставу для плётак... Хворага даглядаць не жадала. З'ехала ў Ленінград, падала на развод... Жылка памёр у 1933-м, пры ім была цацка-бразготка і пасмачка валасоў дачкі. Беатрычэ выхоўвала бабуля.

## 3. ВЕРНАЯ СТАСЯ

Каханне, залатое каханне,
Я стаю, пахіліўшы чало!
Не спаткаў я цябе пры кургане,
Не сустрэў у завейных палёх.
Ты само да мяне, маладога,
Прыгарнулася сэрцам сваім.
Усміхаліся далі, разлогі,
Усміхалася радасць у сінь.
А песні, санцавейныя песні
Разліваліся ўсплёскамі хваль.
Яны з сэрца каханне разнеслі,
Яны з сэрца памчаліся ўдаль.
Ў гэты вечар самоты не песціў,
Найшчаслівейшы быў між людзей.
Ціха зоры смяяліся ў вецці,
Я на іх задуменна глядзеў.
Разгадаць мне хацелася ўсмешку
Адной зоранькі яснай, як дзень.
Ружавела каліна на ўзмежку,
Я прыцісную яе да грудзей.
Застануся з табою, красуня!
Я не ведаў уцехі ў жыцці.
Мне расслухаць хацелася ў шуме,
Аб чым ліст да ліста шапаціць.
Яна слоў мне тады не казала,
Толькі вусны палілі мой твар.
Не было, не было ў песні жалю,
Толькі кідала сэрца у жар.
А што далей?.. у ветра спытайся.
Пакахаў, як ніхто, пакахаў.
Ой ты, Стася, смуглявая Стася,
Ўзгадаваў цябе Случчыны гай!

З-за аўтарства гэтага верша ў наш час адбыліся непаразуменні. Яго паклаў на музыку кампазітар Алег Молчан, песня ўсім палюбілася, трапіла на дыск «Беларускіх Песняроў», а там аўтарам тэксту значыўся паэт-песеннік Лягчылаў. На дыску ж спевака Валерыя Дайнекі аўтарам слоў былі названы Алег Лойка...


Язэп ПУШЧА з жонкай Стасяй.

Давялося аднаўляць справядлівасць. Бо сапраўдны аўтар слоў — Язэп Плашчынскі, вядомы нам як паэт Язэп Пушча. Вядомая і асоба «смуглявай Стасі». Паэт пазнаёміўся з ёй, калі прыехаў у Слуцк выступаць разам з Кузьмой Чорным. На сустрэчу з паэтамі ў клуб прыйшлі васямнаццацігадовая Стася з сяброўкай, паэткай Ідай Чырвань.

Праз нейкі час абедзве сяброўкі выправіліся ў Мінск да жаніхоў. Стася — да Язэпа Пушчы, Іда — да Кузьмы Чорнага. У 1926-м у Язэпа і Станіславы Плашчынскіх нарадзілася першая дачка. У Чорнага і Іды сямейнае жыццё не задалося, разбегліся, моцна памучыўшы адно аднаго.

Калі ў 1930-м арыштавалі Язэпа Пушчу, Стасі і ў галаву не прыйшло выракацца любімага мужа. Яна хадзіла за пятнаццаць кіламетраў у Мінск, насіла яму перадачы. Потым паехала за ім у высылку, дзе нарадзіла трэцюю дачку. Разам і вярнуліся на Беларусь. «Смуглявая Стася» берагла спадчыну паэта, які пасля вяртання ўжо напісаў: «Выстрыгалі з фотакартак, выстрыгаюць і цяпер... Успамінаць мяне не варта ні ў нядзелю, ні ў чацвер».

## 4. НЕДАСЯЖНАЯ АЛЕСЯ

### БЫВАЙ

*(З блёк-ноту таварыша)*

Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая,
Бывай, пялёсткамі развеяная квецць, —
Тваё, чарнявая, юнацтва дагарае
І слоў заранкавая сонечная медзь...
Ці помніш вечару хвіліны агнявыя,
Хто мог юнацкія імкненні затрымаць?..
І песні новыя, і песні маладыя —
На сэрцы ў цвецені звіняў і плакаў май...
Зялёным вечарам ліхое развітанне,
Апошнім вечарам чаромхі мілай пах...
Назаўтра ў шэрані праплакала світанне,
Туман на ростанях скаціўся, ў травы паў...
А ты, каханая, пад скрыпы жоўтых сосен
Пашла, трывожачы сцюдзёную расу, —
Пашла, дзе гойдала зялёнае калоссе
На сцежках ростані пяшчотна-ціхі сум.
Пашла, чарнявая, каб сэрца боллю крануць,
Палыннию горкаю заросці мне ў душы,
Хвілінай зробленыя золкавыя раны
Каб змог у сэрцы я гадамі патушыць...
Пашла за ціхія і дальнія прасторы,
Як казка светлая, ты знікла ў сіняве...
...І сэрца новыя, гарачыя дакоры
Са звонам срэбраным застылі на траве...
Пашла... Забылася... Не вернешся, Алеся...
Бывай, чарнявая, каханая, бывай!..
А дні напорныя ізноў цвітуць і весняць,
І сэрца ў цвецені, і сэрца п'яніць май...
Бывай, абуджаная ў сэрцы, дарагая,
А мне так хочацца юнацтва сыпаць квецць, —
На сэрцы палкае імкненне расцвітае,
А ў словах звонкая, заранкавая медзь!..

Знаёмыя радкі, але нешта не тое? Дзе «бывай, смуглявая», дзе «Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае»? Але менавіта ў такой рэдакцыі быў упершыню, у № 5 «Полымя» 1928 года, надрукаваны верш, які ў іншай, пазнейшай, рэдакцыі аўтара стаў знакамітай песняй «Алеся». Аўтар, Аркадзь Куляшоў, напісаў гэты верш у чатырнаццаць гадоў. Адзінаццацігадовы падлетак з Саматэвіч сустрэў трынаццацігадовую прыгожую дзяўчынку з суседняй вёскі Аляксандру Карыткіну... Кірмаш, карусель, першае пачуццё... Потым вучыўся з той Алесяй, у чатырнаццаць гадоў прызнаўся ў каханні, атрымаў адмову... Шляхі хлопца і дзяўчыны разышліся, але застаўся шэдэўр.

Куляшоў сам расказваў, як у 1950-х дамовіўся сустрэцца са сваім першым каханнем, але ўбачыў пастарэлую, непазнавальную жанчыну праз шкло паштовага аддзялення ў Быхаве — і не выйшаў да яе... Дачка паэта Валянціна Куляшова ў кнізе «Аркадзь Куляшоў. Лясному рэху праўду раскажу...» прыводзіць ліст Аляксандры Карыткінай да Куляшова, напісаны ў 1971 годзе:

«Дарагі Аркадзь! ... цябе цікавіць мінулае, што было б, калі б... і г. д. Магу табе сказаць толькі, што ты мяне ў свой час не разумеў зусім, ды і цяпер таксама, напэўна. У той далёкі год усе мае мары і жаданні былі скіраваныя да адной мэты: вучыцца, спазнаць іншае жыццё. І не аднаму табе я адмовіла, многія могуць на мяне крыўдаваць. А я рвалася, лягцела ў марах і наяве і проста ненавідзела ўсіх, хто мяне затрымліваў. Бо ў мяне не было іншага выбару: ці замуж, ці ехаць вучыцца. А там новыя інтарэсы, новыя людзі, а ты недзе ў мінулым і не паспрабаваў наблізіцца, пазнаёміцца. Адна справа — дзеці, і зусім іншае — сталыя, дарослыя, даводзіцца пазнаваць сябе дзяцінства нанава. А мы так і не сустрэліся зноў, і што ты за чалавек, я так і не даведалася і не ведаю дагэтуль. І ты таксама. Вось і ўся праўда».

Апошні верш у сваім жыцці Куляшоў напісаў пра тую ж карусель, каля якой сустрэў Алесю: «Каруселі кружаць, а дзяцінства убаку стаіць маё — і плача».

## 5. АДДАНАЯ ЯЎГЕНІЯ

Як нескладана стаць адданай,
Згасіць агні юначых дзён,
Пакінуць росныя паляны,
Сысці ў палон, душы прыгон.

Зрачыся долі, нават волі,
Не аглядаючыся, не,
Пачаць жыццё былых нявольніц,
Калі раскутасць толькі ў сне.

Гэты верш у 1940-я гады напісала паэтка Яўгенія Пфляўмбаўм. Праўда, ужо тады мала хто з яе новых знаёмых ведаў, што яна паэтка. Хоць у васямнаццаць мела першы паэтычны зборнік і была сяброўкай «Маладняка». Увесь яе лёс вырашыла каханне. «У жніўні 1931 г. выйшла замуж. А неўзабаве пачаліся ліхія часы, пачаўся перыяд рэпрэсій. Многія былі арыштаваны, у тым ліку і мой муж Максім Лужанін... Мяне звольнілі з газеты «Звязда»... Эшалон з рэпрэсаванымі адпраўлялі ў Сібір. Я праводзіла іх і цвёрда вырашыла ехаць услед, хоць і гэта мне было забаронена».

Яўгенія сапраўды паехала за мужам у Сібір. Потым жылі ў яе сваякоў у Маскве. Даводзілася апраўдвацца за членства ў «Маладняку», калі пачалася вайна — узніклі праблемы з-за нямецкага прозвішча. Мужа забралі на фронт. А калі вярнуўся — вершы, якія пісаліся кожны дзень, так і не выйшлі да людзей... Гэта пра аддана́сць вершы «Алю» яна піша ў вершы... У доме быў адзін паэт, Лужанін паспяхова рабіў кар'еру, а Пфляўмбаўм засяродзілася на тым, каб «адхіляць навальніцу ад дрэва, дзе спявае птах».

Але вершы — яны ж скрозь камень, скрозь час прарастаюць, калі сапраўдныя... Чытайце ж беларускія вершы і разгадвайце іх.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Вернісаж

# ТВОРЧЫ КОД ДАВІДА ЯКЕРСОНА

**Аматараў выяўленчага мастацтва XX стагоддзя ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь чакае манаграфічная выстаўка беларускага скульптара і графіка Давіда Якерсона (1896—1947), прымеркаваная да 125-годдзя з дня яго нараджэння. Наватар і традыцыяналіст, адзін з прадстаўнікоў скульптурнага супрэматызму, які належаў да вядомага авангарднага аб'яднання «УНОВИС», і проста яркі прадстаўнік Віцебскай мастацкай школы — мастак прадстаўлены тут з розных ракурсаў, што дазваляе адчуць атмасферу перыяду, у які ён жыў і ствараў.**



Выставачны праект узнік у рамках супрацоўніцтва НММ і Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, у зборах якога захоўваюцца работы Давіда Якерсона. Экспазіцыя ахоплівае амаль увесь творчы шлях майстра і змяшчае больш за сотню графічных работ, скульптур, узоры графікі, фотаздымкі і многае іншае. Яго творчая спадчына, якая, магчыма, не ва ўсім і не кожнаму зразумелая, але цікавая і дазваляе знайсці тое, што абавязкова адгукнецца.

— Выстаўка не пабудавана па храналагічным прынцыпе, хоць і мае рэтраспектыўны характар, таму што аб'яднаць усе калекцыі, дзе прысутнічае творчасць Давіда Якерсона, сёння проста немагчыма, — адзначае **куратар праекта, загадчык аддзела беларускага мастацтва XX–XXI ст. Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, кандыдат мастацтвазнаўства Кацярына ІЗАФАТАВА.** — Пачынаецца наш расповед пра Якерсона з перыяду «Буры і націску» ў яго творчасці і такой з'явы, як Віцебская народная мастацкая школа, дзе ўзнікла аб'яднанне «УНОВИС», калі ў горад прыязджае Казімір Малевіч са сваёй педагагічнай сістэмай. Аднак, што датычыцца Давіда Аронавіча, то паслядоўнікам і прыхільнікам дадзенага кірунку ён застаецца нядоўга, і ўжо ў 1923 годзе адмаўляецца ад супрэматычнага бэкграўнду і не звяртаецца да эстэтыкі гэтай плыні. Аднак мы можам назіраць, што за такі адносна кароткі час творца праявіў сябе па-рознаму — пласкасны супрэматызм, выхад у аб'ём. Калі паспрабаваць вызначыць своеасаблівы «мастацкі код» Якерсона, то ім можна лічыць яго выяву чалавека, якая складаецца з геаметрычных фігур. У такой агранёнасці чалавека геаметрычнай прасочваецца прарочая функцыя мастака, бо ў другой палове XX стагоддзя з'яўляюцца робаты, знешне падобныя на якерсонскіх людзей... Зразумела, гледзячы на работы супрэматыстаў, не ўзнікае шквалу эмоцый, але гэта яшчэ і таму, што тут галоўныя аптымізацыя, прынцып эканоміі, рух, якія ў суме даюць эстэтыку. Бо сказаць пра складанае проста — таксама мастацтва.

І ў пэўным сэнсе гэта адлюстроўвае сутнасць супрэматызму, які для таго перыяду быў не проста напрамкам у мастацтве, а цэлай філасофіяй бачання навакольнага жыцця і свету. Ён вызваліў творчасць ад выяўленчасці, жыццёвага падабенства, давёўшы мастацкія прыёмы да мінімуму. У 1920 годзе ў Віцебску ўзнікае аб'яднанне «УНОВИС», у якое ўваходзілі Лісіцкі, Чашнік, Хідэкель і інш., а мэтай яго было прасоўванне наватарскіх ідэй у мастацтве. І гэты час дазволіў супрэматызму не толькі праявіцца ў творчасці дадзеных мастакоў, але і, з развіццём вучняў Малевіча яго ідэй, «прагучаць» пазней у дызайне, архітэктуры, паліграфіі і г. д. Як і заяўляў яго стваральнік, супрэматызм увайшоў ва ўсе сферы жыцця чалавека, і сёння гэта стала мовай сучаснай індустрыяльнай культуры, у якой пераважаюць эстэтыка аптымізацыі і эканоміі.

— Выстаўка работ Давіда Якерсона дае магчымасць назіраць усе этапы пераходу мастака ад рэалізму да супрэматызму. Плюс яго творы — гэта адзін з помнікаў віцебскага мастацтва пэўнага часу, — распавядае **старшы навуковы супрацоўнік Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Святлана КОТ.** — І для сучаснікаў гэта якраз магчымасць пранікнуцца атмасферай таго перыяду, адчуць праз мастацтва думкі самога Якерсона.

...Давід Якерсон нарадзіўся ў Віцебску. Дзе і ў якім асяродку рос і фарміраваўся будучы творца — гэта пакуль прабел у яго жыццяпісе, які, магчыма, з часам запоўняць даследчыкі. Вядома толькі, што ён з'яўляўся вучнем Юдэля Пэна ў сярэдзіне 1900-х у Віцебску, вучыўся на будаўнічым факультэце Рыжскага політэхнічнага інстытута, эвакуіраванага ў Маскву. З 1918 да 1922 года вучыўся ў вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях. Пад кіраўніцтвам Марка Шагала ўдзельнічаў у афармленні Віцебска да першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Рэалізоўваў сябе мастак і ў ролі выкладчыка, папоўніўшы педагагічны састаў Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Але, што адметна, ён імкнуўся даць вучням магчымасць бачыць свет з розных ракурсаў і з пазіцыі як традыцыйнага, так і авангарднага мастацтва. Можам мы адкрыць для сябе і зусім іншага Якерсона, калі звернем увагу на яго графічныя работы, дзе ўбачым краявіды яго роднага Віцебска, выявы некаторых помнікаў архітэктуры, як, напрыклад, касцёл Антонія Падуанскага, Царква «Чорная Тройца», што не захаваліся да нашых дзён. Яшчэ нельга не заўважыць яго драўляныя скульптуры, іх таксама бачым у экспазіцыі. Дарэчы, менавіта дрэва стала тым матэрыялам, які скульптар выкарыстоўваў да канца жыцця. Прысутнічаюць у шэрагу яго работ і графічныя выявы дрэў. Сярод скульптур цікавасць выклікае перш за ўсё тое, што там паказаны людзі розных нацыянальнасцяў: «Абісінка», «Тунгус» і іншыя. Справа ў тым, што Якерсон цесна супрацоўнічаў з Дзяржаўным музеем народазнаўства, дзе і ствараў скульптурныя партрэты розных этнічных груп. А вось яго скульптура «Апавядальніца былін» — гэта ўжо работа перыяду маскоўскай позняй творчасці 1930-х гадоў.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота прадастаўлена Нацыянальным мастацкім музеем.**

Анонс

## Чытаем Дубоўку анлайн

**24 сакавіка а 14-й гадзіне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пройдзе падвядзенне вынікаў Рэспубліканскага анлайн-конкурса чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», прысвечанага 120-годдзю Уладзіміра ДУБОЎКІ.**

Інфармацыйнымі партнёрамі творчага праекта выступілі часопісы «Маладосць» і «Бярозка». Удзел у конкурсе ўзялі 880 чалавек з усёй Беларусі, а таксама — з-за мяжы. Ініцыятыва Нацыянальнай бібліятэкі і беларускіх літаратурных часопісаў атрымала шырокі водгалас і ў Беларусі, і за яе межамі.

На падвядзенні вынікаў адбудзецца ўзнагароджанне памятнымі прызамі і дыпломамі пераможцаў конкурсу ў розных узроставых катэгорыях, а таксама ў дадатковых намінацыях.

— Праект і нам прынёс толькі станоўчыя эмоцыі, — каментуе саму ідэю конкурсу чытальнікаў вершаў аднаго паэта **намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» пісьменнік Аляксей ЧАРОТА.** — Спадзяюся, што такія анлайн-конкурсы адбудуцца і ў сувязі з чытаннем вершаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, чые юбілеі мы будзем святкаваць у 2022 годзе.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# Сімвал гасціннасці з адлюстраваннем часу

**Да 4 красавіка 2021 года ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрыта выстаўка «Простыя рэчы. Імбрыкі», якая дэманструе палітру вырабаў Мінскага і Добрушскага фарфоравых заводаў 1960—2000-х гадоў.**

Калі паглыбіцца ў гісторыю, то першаадкрывальнікамі фарфору былі кітайцы яшчэ ў шостым стагоддзі. Потым сакрэтнае спалучэнне інгрэдыентаў доўга шукалі еўрапейскія вучоныя, і ў 1708 годзе ў Саксоніі Эрэнфрыд Вальтер Чырнгаўз і яго вучань Іаган Фрыдрых Бетгер адкрылі сакрэт белай парцэляны. І пасля смерці першага якраз яго паслядоўніку, які працягнуў гэтую справу, і прыпісалі ўсе заслугі.

Што датычыцца нашай зямлі, Свержанская фаянсавая мануфактура (цяпер Новы Свержань) заснавана Міхалам Казімірам Рыбанькам у 1742 г., але ўзораў яе вытворчасці ў музейным зборы, на жаль, няма. У Беларусі сучасная гісторыя фарфору бярэ свой адлік ад сакавіка 1951 года, калі Мінскі кафляны завод перайменавалі ў фарфорава-фаянсавы, але праіснавала вытворчасць да 2009 года. Першая прадукцыя на Добрушскім фарфоравым заводзе была выраблена 28 снежня 1978 года, які ў гісторыі стаў днём заснавання прадпрыемства. Яно дзейнічае і радуе сваіх пакупнікоў і да сёння.

— Тое, што гісторыя беларускага фарфору пачалася значна пазней, чым у той жа Еўропе, вядома, аказала пэўны ўплыў. Бо дазволіла нашым вытворцам развівацца і ўдасканальвацца, абапіраючыся на ўжо здабытых іншымі вопыт. Выстаўка задумвалася як адна з цыкла праектаў, прысвечаных беларускаму фарфору. Вядома, у нас не было такіх вытворчасцяў, як Імператарскі фарфоравы завод у Расіі ці Мейсенскі ў Германіі, але ўсё ж існуе такое паняцце, як беларуская прамысловая вытворчасць фарфору. Напрыклад, Мінскі фарфоравы завод прапрацаваў толькі да 2000-х гадоў, але там быў іх уласны музей, дзе збіралі па адным экземпляры ўсяго, што выпускалі. Пасля закрыцця вытворчасці калекцыя перайшла ва ўласнасць музея, — распавядае **куратар праекта мастацтвазнаўца Марына КАЗАНЦАВА.** — У цэнтры ўвагі выстаўкі імбрык як сімвал дому, гасціннасці і ўтульнасці. Кожны з экспанатаў паказвае тыя тэндэнцыі, па якіх развівалася матэрыяльная культура, як змяняліся густы, тэхнікі, тэхналогіі.

Чайнікі з'яўляюцца аднымі з самых папулярных і традыцыйных відаў посуду ў кожнай сям'і. Калі звярнуцца да слоўнікаў, сустрэнем сцверджанні, што «імбрык», «імбрычак» — састарэлае слова, якое абазначае сасуд для заварвання, а «чайнік» мае значэнне і як сасуд для кіпячэння вады, і як сасуд, напрыклад, фарфоравы для заварвання чаю. Выстаўка адлюстроўвае змены формы і спосабаў аздаблення фарфору пад уплывам часу, моды і стыляў. Упершыню наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з прыкладамі вырабаў, якія былі дапушчаны ў вытворчасць Мастацкім саветам Мінскага фарфоравага заводу з 1960-х гг.



Так, тут прадстаўлены сервіз, які вырабілі на Мінскім заводзе ў 1963 годзе. Яго аўтар — мастак Віктар Гаўрылаў. Бачым простую форму і апрацоўку золатам, а таксама надпіс «обрaзец», які і сведчыць, што перад намі той самы першы экземпляр. Такія рэчы, адзначае мая суразмоўніца, у музейным свеце вельмі цэняцца. І ўвогуле ўсе вырабы, якія экспануюцца на выстаўцы, паказваюцца ўпершыню. Можна тут убачыць чайнікі Леаніда Багданава, дзе адразу адчуваецца атмасфера 60-х, бо прастата формы і аздаблення і ёсць сведкі таго перыяду, калі ў прыярытэце была зручнасць. Звяртаюць на сябе ўвагу аўтарскія экземпляры чайнікаў, адметных сваёй кампазіцыяй, з выкарыстаннем золата для выдзялення асобных дэталяў. Напрыклад, на адным з вырабаў мы бачым сюжэт, дзе ёсць бабуля і дзядуля, і гэта нібы адразу навявае асацыяцыі з казкамі, аднак тут яны мараць не пра залатую рыбку, а пра кавамолку... Фантазія мастакоў — яна такая непрадказальная. А вось камплект «Чабор», у ім кубкі маюць выгляд піял, і тое невыпадкова, бо рабілі яго па замове для краін Сярэдняй Азіі. Альбо непадалёк бачым чайнік, які весела нам усміхаецца, а побач — статуэтачка клоуна. І зноў адкрыццё: аўтар яе дызайну — Сяргей Арлоў, той самы, што стварыў помнік Юрыю Далгарукаму ў Маскве. Сярод аўтараў прадстаўленых вырабаў з фарфору сустракаеш імёны Віктара Гаўрылава, Леаніда Багданава, Валерыя Леантовіча і многіх іншых. Кампазіцыі некаторых камплектаў, такіх як «Лянок», «Агрэст», «Альтанка», «Валошкі», не толькі адсылаюць нас да тэмы беларускіх матываў у творчасці тагачасных мастакоў фарфоравых заводаў, але і даюць асалоду назіраць за спалучэннем фарбаў, шукаць разгадкі аўтарскіх вобразаў. А вось той самы трохузроўневы чайнік з афішы аказваецца таксама работай Леаніда Багданава, аднак ужо настолькі іншай па стылі і аздабленні, калі параўноўваць са згаданай раней стылістыкай 60-х гадоў, што шчыра здзіўляешся.

Ужо пасля знаёмства з выстаўкай цікаўлюся, як можна ахарактарызаваць сённяшні попыт на вырабы з фарфору, ці адчуваецца з'яўленне новай моды на яго? Марына Вадзімаўна адзначае:

— Цяпер існуе вялікі інтарэс да збору падобных рэчаў, старой скульптуры. Хоць, вядома, калі казаць пра той жа аўтарскі фарфор, які робіцца з выкарыстаннем дарагіх матэрыялаў і распісваецца ўручную, то гэта прадмет раскошы, і яго не кожны можа сабе дазволіць. І вялікая ўдача, калі цікавыя экземпляры трапляюць у фонды музеяў.

**Алена ДРАПКО, фота аўтара.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Технолит Полоцк», 211408, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101 |

**Оборудование и транспортные средства, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101**

| № лот | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 568 | Автомат резьбонакатной /нест/ А9518А | 7 200,00 | 360,00 |
| 2 | 1574 | Вальцы 008Н047.00.000 | 8 520,00 | 426,00 |
| 3 | 3712 | Вальцы прокатки вн цилиндр 5РС-003 | 3 960,00 | 198,00 |
| 4 | 3711 | Вальцы прокатки вн цилиндр 5РС-003 | 3 960,00 | 198,00 |
| 5 | 200 | Горизонтально-фрезерный станок 6м 82А | 4 800,00 | 240,00 |
| 6 | 1723 | Ленточнопильный станок ARG 300 plus | 6 120,00 | 306,00 |
| 7 | 3264 | Машина листогибочная ив 2144 П | 9 240,00 | 462,00 |
| 8 | 3275 | Машина листогибочная ИВ-1330 | 12 360,00 | 618,00 |
| 9 | 1543 | Ножницы гильотинные Н-475 | 6 480,00 | 324,00 |
| 10 | 47 | Ножницы гильотинные Н3118 | 5 040,00 | 252,00 |
| 11 | 4798 | Ножницы кривошипные листовые с наклонным ножом НП3121А | 53 760,00 | 2688,00 |
| 12 | 1609а | Пресс гидравлический П-6324 | 5 280,00 | 264,00 |
| 13 | 4797 | Пресс листогибочный гидравлический с чпу ип143 | 182 400,00 | 9120,00 |
| 14 | 738 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 10 800,00 | 540,00 |
| 15 | 3527 | Станок вертикально-сверлильный МН-25-Н | 11 040,00 | 552,00 |
| 16 | 2494 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 4 680,00 | 234,00 |
| 17 | 1988 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 4 680,00 | 234,00 |
| 18 | 2222 | Станок вертикально-сверлильный 2Н150 | 5 040,00 | 252,00 |
| 19 | 2899 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 | 10 800,00 | 540,00 |
| 20 | 2008а | Станок вертикально-фрезерный 6М13гн-1 | 7 080,00 | 354,00 |
| 21 | 4760 | Станок для плазменной резки металла HY S | 76 680,00 | 3834,00 |
| 22 | 3827 | Станок КА-280 токарно-винторезный универсальный | 8 280,00 | 414,00 |
| 23 | 2279 | Станок координатно-расточной 2Д 450-Ф2 | 11 880,00 | 594,00 |
| 24 | 1120 | Станок координатно-расточной 2А430 | 6 840,00 | 342,00 |
| 25 | 1015 | Станок координатно-расточной 2В440А | 8 160,00 | 408,00 |
| 26 | 4711 | Станок ленточнопильный ARG250PLUS | 10 560,00 | 528,00 |
| 27 | 3232 | Станок радиально-сверлильный 2532Л | 6 600,00 | 330,00 |
| 28 | 3443 | Станок радиально-сверлильный 2К522 | 8 160,00 | 408,00 |
| 29 | 523 | Станок токарно-винторезный SAMAT 400S/S.1.196 | 22 920,00 | 1146,00 |
| 30 | 388 | Станок токарно-винторезный 1М63 | 10 440,00 | 522,00 |
| 31 | 324 | Станок токарно-револьверный 1Е365БП | 9 840,00 | 492,00 |
| 32 | 409 | Токарно-винторезный станок 16к20 | 5 280,00 | 264,00 |
| 33 | 468 | Вертикаль-сверлильный станок 2Н135 | 4 680,00 | 234,00 |
| 34 | 881а | Станок токарно-винторезный 16К25 | 11 040,00 | 552,00 |
| 35 | 3789 | Станок токарно-винторезный 1в 62г | 5 400,00 | 270,00 |
| 36 | 2916 | Станок токарно-винторезный 1В62Г | 5 400,00 | 270,00 |
| 37 | 3143 | Станок токарно-винторезный 1В62Г | 6 480,00 | 324,00 |
| 38 | 858 | Станок токарно-винторезный 1К62 | 4 200,00 | 210,00 |
| 39 | 3508 | Станок токарно-винторезный АР-77 | 6 480,00 | 324,00 |
| 40 | 4712 | Станок токарно-винторезный ГС 526 | 41 760,00 | 2088,00 |
| 41 | 1102 | Станок плоско-шлифовальный 3Д732 | 14 160,00 | 708,00 |
| 42 | 1589 | Вальцы 008.Н75.00.000 | 15 720,00 | 786,00 |
| 43 | 1323 | Станок фуговочный | 2 520,00 | 126,00 |
| 44 | 414 | Станок универсальный по дереву | 1 920,00 | 96,00 |
| 45 | 4367 | Автомобиль Mitsubushi Pajero (рег. знак 9111 ВТ) | 3 480,00 | 174,00 |
| 46 | 464 | Автомобиль GAZ 330210 (рег. знак ВМ 1516) | 1 440,00 | 72,00 |
| 47 | 4801 | Тележка к трактору (инв. № 4801) | 228,00 | 11,40 |

**Транспортные средства, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 48 | 5002 | Автомобиль MAZ 54324 (рег. знак ВМ 5286) | 3 600,00 | 180,00 |
| 49 | 1092 | Автомобиль ГАЗ 31105 (рег. знак 0777 АI-2) | 1 200,00 | 60,00 |
| 50 | 466 | Полуприцеп MAZ 9397 (рег. знак АА-2 2997) | 2 640,00 | 132,00 |
| 51 | 4735 | Машина для внесения жидких органических удобрений РЖТ-4М | 5 760,00 | 288,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Крыленко Николай Николаевич, тел. 8029-590-87-81

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (от 1 % до 10 %) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 05.02.2021 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **08.04.2021 в 13.00 по адресу: ОАО «Технолит Полоцк», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101, 2-й этаж, актовый зал** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **05.04.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| Продавец | Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| Адрес ЭТП | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н**

| Наименование | Общ. пл. | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Здание магазина** | 98,7 кв. м | 600/С-165553 | **Крупицкий с/с, д. Дедовка, 1А** |

Составные части и принадлежности: сарай

**Сведения о земельном участке:** пл. **0,1334** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений магазина

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 24 255,33 бел. руб.** (снижена на 30 %)

| Наименование | Общ. пл. | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Лот № 2** | | | |
| **Магазин № 42** | 82,8 кв. м | 600/С-142555 | **Крупицкий с/с, д. Самуэлево, ул. Кооперативная, 1Б** |

Составные части и принадлежности: две пристройки, навес, крыльцо, дымовая труба

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0262 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 24.02.2041) для обслуживания здания магазина № 42. Ограничения (обременения): водоохранная зона реки Птичь вне прибрежной полосы

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 89 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.01.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 23.04.2021 в 12.00. Окончание торгов: 23.04.2021 в 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.04.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Предмет торгов**:

**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым номером 724484403101000272, расположенный по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Полыковичский с/с, д. Купёлы, ул. Центральная, площадью 0,1500 га, назначение – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Характеристики лота № 1. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Ограничения (обременения) прав на зем. участок: охранные зоны линии электропередачи. Сведения об ограничениях (обременениях) прав на соответствующее имущество: арест постановлением следователя СУ УСК РБ по Могилевской области от 13.10.2016 б/н (арест снимается по решению суда после полной оплаты стоимости приобретенного имущества). Нач. цена продажи имущества снижена на 50 % от первоначальной стоимости.

**Нач. цена продажи имущества: 3510,00 белорусских рублей и 00 копеек. Размер задатка: 351 белорусский рубль 00 копеек. Для участия в аукционе приглашаются** граждане РБ и негосударственные юридические лица РБ.

**Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым номером 724482804101000509, расположенный по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Мостокский с/с, аг. Мосток, площадью 0,1500 га, назначение – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Характеристики лота № 2. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Сведения об ограничениях (обременениях) прав на соответствующее имущество: запрещение ОПИ Октябрьского района г. Могилева от 03.04.2017 б/н на совершение сделок по отчуждению (запрет снимается после полной оплаты стоимости приобретенного имущества). Нач. цена продажи имущества снижена на 50 % от первоначальной стоимости.

**Нач. цена продажи имущества: 4455,00 белорусских рублей и 00 копеек**. Размер задатка: 445 белорусских рублей и 50 копеек. **Для участия в аукционе приглашаются** граждане РБ и негосударственные юридические лица РБ.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Могилевской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, в котором имущество состоит на учете, но не более чем на 20 рабочих дней; 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении юридическое лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенную доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Повторный аукцион состоится 08.04.2021 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи заявления и документов: с 22.03.2021 в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 4). Последний срок подачи заявления и прилагаемых к нему документов **07.04.2021 до 17.30.** Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» от 14.12.2019, 15.08.2020. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. **Телефоны для справок: 8 (0212)24-63-12, 8 (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

---

***ООО «Центр Белинвентаризация»***
***г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1***

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельский литейный завод «ЦЕНТРОЛИТ», тел. 8 (044) 544 38 37

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (прачечная) с инвентарным номером № 350/С-100948 (составные части и принадлежности: крыльца), расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005007393 площадью 0,0776 га | **42 160,00** | **4 216,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 07 апреля 2021 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **09 апреля 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете ***«Звязда» от 20.03.2021 г.*** |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость лота, сформированную на аукционе в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.02.2021 г. |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45.**

---

### Могилевский филиал
## РУП «Институт недвижимости и оценки»
### информирует о проведении 07.04.2021 повторного аукциона по продаже имущества ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Лот № 1: **Капитальное строение с инв. № 732/С-5785 – склад-навес,** общ. пл. 2867 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, участок № 1, на земельном участке с кадастровым номером: 723550100001000502 (право аренды, площадь – 1,5323 га). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.

***Начальная цена продажи: 134 250,00 бел. руб. с учетом НДС.***

Лот № 2: **Капитальное строение с инв. № 732/С-5787 – арматурный цех,** общ. пл. 1711 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, участок № 2, на земельном участке с кадастровым номером: 723550100001000503 (право аренды, площадь – 0,3913 га).

***Начальная цена продажи: 93 750,00 бел. руб. с учетом НДС.***

**Аукцион состоится 07 апреля 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 18.12.20 и 06.02.21.

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by.**

---

## ООО «ТендерКонсалт» (УНП 192347368)

объявляет о проведении **22.04.21 г. с 9.00 до 16.00** на электронной торговой площадке **TC-TORGI.BY** электронных торгов в форме аукциона

**Предмет торгов:** Капитальное строение с инвентарным номером 500С-15894, расположенное по адресу: **г. Минск, ул. Пионерская, 45,** общей площадью 1677,8 кв. м.

Начальная цена: **8 600 000,00** бел. руб. без НДС.

Размер задатка – **2 %** от начальной стоимости предмета торгов.

Прием заявок на участие: с 9.00 21.03.2021 до 17.00 21.04.2021 по тел. +375 29 3267040, **TC-TORGI.BY**

## Чаму абвалілася «блізкаўсходняя Швейцарыя»?

# ЛІВАН У АГНІ

**Ліван апынуўся на мяжы харчовага крызісу. Усяму віной чарговае абясцэньванне нацыянальнай валюты, якая за апошнія два тыдні страціла яшчэ 25 працэнтаў у адносінах да долара. Прадуктовыя крамы ў Бейруце былі вымушаны абмежаваць гадзіны работы і скараціць дастаўку з-за недахопу тавараў, паведаміў 24.kz. Некаторым і зусім прыйшлося зачыніцца на нявызначаны час. Улады краіны таксама паведамілі, што з-за змяншэння валютных запасаў ліванцам скароцяць выплаты харчовых субсідый. «Мы перажываем найгоршыя дні, — заўважыў кіраўнік гандлёвай асацыяцыі Алі Аль-Шарыф. — Летась зачынілася каля чвэрці крамаў, а сёлета можа зачыніцца яшчэ 40 працэнтаў з-за сітуацыі з курсам валют і зніжэннем пакупніцкай здольнасці грамадзян». Чаму абвалілася краіна, якая дагэтуль па праве лічылася «блізкаўсходняй Швейцарыяй»?**

### КАМУНАЛЬНЫ КАЛАПС

Пагаршэнне эканамічнага становішча насельніцтва, незадаволенасць сацыяльна-палітычнымі ўмовамі — і ў асаблівасці распаўсюджваннем і паглыбленнем карупцыі на месцах, прававая неабароненасць часткі грамадства і іншыя прыклады збою ў рабоце дзяржаўнай машыны сталі ў Ліване сумнай рэчаіснасцю, заўважыў expert.ru. Планы ўрада ўвесці падатак на размову па інтэрнэце праз дадаткі (напрыклад, WhatsApp) ва ўмовах дарагой сотавай сувязі справакавалі ў 2019-м маштабныя пратэсты — маніфестанты запатрабавалі змены ўрада і правядзення рэформаў. І што ў выніку? Урад змяніўся двойчы, перш чым вярнуўся да... зыходнага пункта. Кабінеты «тэхнакратаў» Хасана Дзіяба і Мустафы Адзіба пачыналі з папулісцкіх лозунгаў (барацьба з карупцыяй, рэформы, раззбраенне шыіцкіх груповак, прыцягненне знешняй дапамогі і г. д.), але завяршалі тым, што прызнавалі сваю нядзольнасць змяніць сітуацыю.

Наглядным прыкладам дзейнняў палітычных вярхоў з'яўляецца крах сістэм жыццезабеспячэння: веерные адключэнне электрычнасці прывяло да з'яўлення кантрабанды паліва і генератараў, паведаміў riafan.ru. У Бейруце стала нормай адключэнне электрычнасці на тры і больш гадзін у суткі. У некаторых раёнах сталіцы яго не бывае да 12 гадзін. Улады не могуць даць выразных тлумачэнняў, чаму так адбываецца.

Абвастрылася праблема водазабеспячэння: акрамя пастаянных перабояў у падачы вады, адсутнічаюць тарыфы на яе і інструменты ўліку. Сістэма каналізацыі практычна не падтрымліваецца, а сцёкавыя воды не ачышчаюцца, што справакавала санітарны крызіс.

### НА МЯЖЫ ГОЛАДУ

Ужо да 2018 года назіраўся дэфіцыт бюджэту ў 10 працэнтаў, а дзяржаўны доўг склаў больш за 79 мільярдаў долараў — 149 % ад ВУП. У дадатак да ўсяго вайна ў Сірыі прывяла да з'яўлення ў Ліване 1,2 мільёна бежанцаў, якія сталі займаць мясцовыя рабочыя месцы за кошт нізкіх уласных патрабаванняў да зарплаты.

Акрамя таго, пранікненне ў краіну тэрарыстычных ячэек прывяло да рэзкага падзення ўзроўню бяспекі, што шматразова скараціла турпаток. Па ланцужку абрынулася турыстычная сфера, і, акрамя скарачэння валютных паступленняў, дзясяткі тысяч ліванцаў страцілі рабочыя месцы. Да кастрычніка 2019 года агульнае беспрацоўе дасягнула 25 працэнтаў, прычым сярод моладзі яно склала 37 %.

У бюджэце на 2020 год прадугледжвалася зніжэнне выдаткаў на адукацыю і ахову здароўя — на 7 працэнтаў, на «камуналку» — на 88 %, на інфраструктуру — на 95 %. У сваю чаргу, павышэнне ПДВ павялічыла кошт прадуктаў першай неабходнасці ў некалькі разоў. Вясной 2020 года Бейрут звярнуўся да МВФ з просьбай аб рэструктурызацыі знешняга доўгу і аб выдачы крэдыту памерам 10,2 мільярда долараў. Узамен валютны фонд запатрабаваў ад Лівана выканаць шэраг цяжкіх умоў, што выклікала пагаршэнне ўзроўню жыцця насельніцтва на найбліжэйшыя гады.

Акрамя хранічнага крызісу ва ўсіх сферах грамадства, кіруючыя колы Лівана сутыкнуліся з новым выклікам: дзяржава аказалася негатовая супрацьстаяць пандэміі, абараніць сваё насельніцтва ці хоць бы прыцягнуць замежную дапамогу, што стала дадатковай падставай для росту пратэсных настрояў. Звяртаючыся да крайніх мер у выглядзе агульнанацыянальнай ізаляцыі, палітыкі імкнуліся не толькі стрымаць распаўсюджванне ковіду і адцягнуць калапс сістэмы аховы здароўя, але таксама выкарыстоўвалі абмежавальныя меры для падаўлення пратэснай актыўнасці, падкрэсліў expert.ru. 22 студзеня было абвешчана, што рэжым кругласутачнай самаізаляцыі прадаўжаецца да 8 лютага, што на фоне бяздзейнасці ўлад, адсутнасці праграмы падтрымкі для маламаёмных і скарачэння субсідый стала спускавым механізмам для адчайных пратэстаў насельніцтва, якое апынулася на мяжы голаду.

### ДЭЗЕРЦІРЫ МІЖВОЛІ

Паводле даследавання гуманітарнай арганізацыі CARE, пасля інфляцыі ліванскага фунта, узровень якой летась у лістападзе дасягнуў рэкордных 553 працэнтаў, каля 94 % насельніцтва Лівана пачало



атрымліваць зарплату ніжэй за мінімальны пражытачны мінімум. Яшчэ ў красавіку мінулага года Трыпалі і Бейрут узначалілі «галодныя пратэсты» пасля ўвядзення ў Ліване першага каранціну.

Сутыкненні былі вельмі жорсткія. Як паведаміла галоўнае ўпраўленне ўнутранай бяспекі Лівана, за тыдзень пратэстаў у Трыпалі дэманстранты выкарысталі супраць паліцыі 16 баявых гранат і 600 бутэлек з запальнай сумессю. Сілы бяспекі, якія, паводле справаздачы арганізацыі Amnesty International, ужывалі для разгону натоўпу гумовыя кулі, гранаты са слёзатачывым газам і гранатамёты.

Тым часам галоўнакамандуючы войска Джозэф Аун папярэдзіў палітыкаў, што крызіс паставіў пад пагрозу само існаванне ўзброеных сіл. «Салдаты галадаюць, таксама як і народ, — сказаў генерал на прэс-канферэнцыі, перадала «Бі-бі-сі». — Ім патрэбнае войска ці не? Вы хочаце, каб войска моцна стаяла на нагах, ці не? Ім усё роўна». Генерал Аун не ўдакладніў, супраць каго накіраваны яго гнеў.

Але раней прэзідэнт краіны Мішэль Аун сабраў экстранную нараду і запатрабаваў ад сілавых структур не дапусціць блакавання дарог падчас «панядзелка гневу», як назвала сваю акцыю апазіцыя. (Дарэчы, Джозэф і Мішэль Аун — цёзкі. Абодва носяць званне генерала).

Вайскоўцы не супярэчаць прэзідэнту прама. Аднак крыніца агенцтва Reuters распавяла, што патрабаванне прэзідэнта прывяло да рознагалоссяў паміж ім і галоўнакамандуючым. Джозэф Аун заклікаў палітыкаў знайсці выхад з крызісу, які доўжыцца не адзін год. «Афіцэры таксама пакутуюць і галадаюць. Я звяртаюся да чыноўнікаў: куды вы ідзяце? Чаго вы чакаеце? Што плануеце зрабіць?» — заявіў генерал. Армія і міністэрства ўнутраных спраў адмаўляюць паведамленні аб дэзерцірстве ў шэрагах сілавых структур. Аднак тры крыніцы агенцтва прызналіся, што становішча ніжэйшага звяна арміі і паліцыі выклікае рэальныя асцярогі.

Крызіс прывёў і да росту злачыннасці. Колькасць забойстваў у краіне вырасла ў 2020 годзе больш чым на 90 працэнтаў, а рабаванняў — на 57 %, паводле даследавання фірмы Information International на аснове даных паліцыі.

Дабрачынная арганізацыя YASA, якая займаецца бяспекай на дарогах, падлічыла, што каля 10 тысяч накрывак ад люкаў зніклі з вуліц Лівана. Іх крадуць і прадаюць скупшчыкам чыгуну па 100 фунтаў кожную — больш, чым пражытковы мінімум у краіне.

### ПАМІЖ МОЛАТАМ І КАВАДЛАМ

Хасан Дзіяб сумна вядомы тым, што менавіта ў перыяд яго дзейнасці на пасадзе прэм'ера адбыўся страшэнны выбух у порце Бейрута, які прывёў да масавых ахвяр і татальных разбурэнняў. Пратэстуючае насельніцтва абвінаваціла ў тым, што здарылася, урад, і неўзабаве кабмін зноў у поўным саставе сышоў у адстаўку.

Па просьбе прэзідэнта Лівана Мішэля Ауна Дзіяб застаўся на пасадзе прэм'ер-міністра да стварэння новага ўрада. Яго фарміраванне было ўскладзена на папярэдняга прэм'ера — лідара суніцкага руху «Аль-Мустакбаль» Саада Аль-Харыры, які абапіраецца на падтрымку ЗША і Францыі. «Ліван працягвае знаходзіцца паміж амерыканскім молатам і французскім кавадлам», — адзначыў ТАСС палітолаг Роберт Аб'яд.

Аль-Харыры да канца 2020 года падаў 18 кандыдатур для кабінета міністраў. Аднак у студзені зяць Ауна, кіраўнік прэзідэнцкай партыі Джэбран Басіль, абвінаваціў патэнцыйнага прэм'ера ў датычнасці да крызіснай сітуацыі ў Ліване і заявіў аб тым, што ўраду патрэбны новыя людзі. Такім чынам, фарміраванне кабміна «павісла ў паветры», паколькі яго прапанаваны састаў да гэтага часу не ўхвалены прэзідэнтам і парламентам. Сапраўды гэтак жа не вызначаны лёс Дзіяба, які ўжо больш за паўгода займае пасаду кіраўніка неіснуючага ўрада.

Заява прэм'ера аб гатоўнасці пакінуць сваю пасаду прагучала пасля распаўсюджвання відэазапісу, на якім наведвальнікі аднаго са сталічных супермаркетаў зладзілі масавую бойку з-за пачкі сухога малака. «Хіба бойкі за малако не з'яўляюцца дастатковым стымулам для таго, каб пераадолець фармальнасці і сфармiраваць урад? Калі мая адстаўка паскорыць стварэнне кабінета міністраў, то я гатовы пайсці на гэта, хоць і лічу падобнае рашэнне дэструктыўным для дзяржавы», — паведаміў Дзіяб падчас тэлеінтэрв'ю.

Перастрэлкі з паліцыяй, знішчэнне інфраструктуры і параліч транспарту, захопы адміністрацыйных будынкаў і бойкі за пакет сухога малака яскрава адлюстроўваюць нарастанне азлобленасці і адчаю ліванскага насельніцтва. Пратэснай плыні не прамінулі скарыстацца. Як лічыць палітолаг Роберт Аб'яд, нядаўнія падзеі сведчаць пра спробы радыкальных сіл абвастрыць сітуацыю ў краіне на фоне зацяжнога палітычнага вакууму. Ліван застаецца ў агні.

**Захар БУРАК.**


## ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

**21 апреля 2021 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке, руб. | Примечание |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Деревни Старина, уч. 7А | 0,1500 | 625680202201000316 | 15 000,00 | 1 337,31 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению |
| Лот № 2 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Ясная, 26 и расположенное на нем не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение (фундамент) | 0,1498 | 625680202201000171 | 26 000,00, из них – земельный участок – 13347,18 фундамент – 12652,82 | 298,65 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению |
| Лот № 3 | Дещенский сельисполком | д. Зелень, ул. Центральная, уч. 6А | 0,2500 | 625683803601000031 | 8 000,00 | 81,00 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к электроснабжению |
| Лот № 4 | Дещенский сельисполком | д. Русаково, ул. Русаковская, уч. 2 | 0,1000 | 625680211501000031 | 5 000,00 | 0 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к электроснабжению |
| Лот № 5 | Дещенский сельисполком | д. Рыбаковщина, ул. Рыбаковщинская, уч. 20А | 0,1033 | 625680211701000042 | 6 000,00 | 1 657,08 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к газоснабжению. электроснабжению |
| Лот № 6 | Дещенский сельисполком | д. Теплень, ул. Новая, уч. 29 | 0,1500 | 625680213201000222 | 10 000,00 | 1 580,14 + расходы на публикацию | имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО AKBBBY2X, УНП 601068832. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **16 апреля 2021 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенный банком документ об оплате задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников. В случае если участник один, аукцион признается несостоявшимся и комиссия имеет право принять решение о продаже единственному участнику аукциона земельного участка в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов (с согласия участника).

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем самостоятельного выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: info@uzda.gov.by, либо по телефонам: (801718) 35135, 35149.

# Ірына Жук.
# ДЗЯЎЧЫНА, ЯКАЯ ЛЯТАЕ



**ІМЯ Ірыны Жук добра вядомае ў свеце беларускай лёгкай атлетыкі. Для спецыялістаў яна — унікальная спартсменка, якая б'е рэкорд за рэкордам. У пачатку сакавіка за адно выступленне Ірына двойчы перапісала асабісты і нацыянальны рэкорд у памяшканні. Спачатку ўзляцела на 4,68 метра, потым — 4,73. Для маладых калег яна — лідар, на якога трэба раўняцца. Для мнагаборца Віталя Жука — любімая жонка. Для трэнера Юрыя Кавальчука — выдатная вучаніца. А для ўсіх аматараў — вялікая надзея на Алімпійскіх гульнях у Токіа.**

**У сакавіку на чэмпіянаце Еўропы ў памяшканні Ірына Жук стала спартсменкай, якая ўжо дакладна запісала сваё імя ў гісторыю айчыннай лёгкай атлетыкі. Яна першая сярод беларусаў заваявала медаль кантынентальнага першынства ў скачках у вышыню. Як гэта — быць Ірынай Жук, спартсменка расказала «Звяздзе».**

***— Ірына, падзяліся, калі ласка, сваімі ўражаннямі ад выступлення на чэмпіянаце Еўропы.***

— Скажу шчыра, я была засмучана сваім вынікам. Пераможца скокнула ўсяго на два сантыметры вышэй за мой асабісты рэкорд у гэтым сезоне. Яна ўзяла 4,75 метра, а мой нядаўні рэкорд — 4,73 метра, а ў Торуні я ўзяла толькі 4,65. Я задала вышыню 4,78 метра, але рукой збіла планку. Я была гатовая перамагаць, я дзеля гэтага ехала, таму і засмуцілася. Так, гэта першы медаль у гісторыі беларускіх скачкоў з шастом, і мая першая такая значная ўзнагарода. Аднак у жыцці заўсёды ёсць нейкае «але». Мне здаецца, я ніколі не буду цалкам задаволеная сваімі вынікамі.

І ўсё ж мяне радуе, што я пачала спаборнічаць са сваімі асноўнымі саперніцамі, з якімі сустрэнуся на Алімпійскіх гульнях. Яны ўсе сталі выступаць значна лепш, чым раней. Але і я прадукцыйна праводзіла час і таксама ўдасканаліла сваю форму. Барацьба стала яшчэ цікавейшая.

***— У цябе ёсць адказ на пытанне, чаму не ўсё задуманае атрымалася?***

— Я чакала ад сябе перамогі на чэмпіянаце Еўропы, і гэта моцна на мяне ціснула. Я не баялася, што ад мяне чакаюць перамогі аматары, трэнер, федэрацыя. Як можна чакаць перамогі ад чалавека, які да гэтага не заваёўваў медалёў? Але я адчувала, што ўсе чакаюць ад мяне высокага выніку. І гэта таксама ціснула. Аднак у пэўнай ступені я сама сабе нашкодзіла. На Алімпійскіх гульнях у Токіа ўсё будзе інакш. Я ўжо зразумела, як гэта — змагацца за медалі і чакаць ад сябе выдатных вынікаў. Я буду гатовая да такога стану і буду ведаць, што з ім рабіць. Чэмпіянат Еўропы даў мне вопыт, які патрэбна было прайсці і перажыць, каб быць яшчэ лепшай і мацнейшай.

***— Ты раздзяляла бронзавы медаль з брытанкай Холі Брэдшоу. Часта такое здараецца?***

— У скачках з шастом гэта нармальная практыка. Самае цікавае, што мы абедзве былі галоўныя фаварыткі турніру і абедзве занялі трэцяе месца. І пасля разам ад душы пасмяяліся. Супакойвала, што я не адна такая, у каго рэчаіснасць не пацвердзіла чаканні.

***— Можа, сваю справу зрабіла і тое, што ў Торуні не было жывой падтрымкі мужа?***

— Віталя вельмі не хапала на чэмпіянаце Еўропы. Яго заўсёды не хапае, калі мы не разам. Увогуле, мне пашчасціла, што мой муж — таксама спартсмен. Мне здаецца, я не магла б быць з чалавекам з іншай сферы. Ён, напэўна, патрабаваў бы, каб я займалася домам, нарадзіла дзіця. Звычайнаму чалавеку цяжка зразумець і прыняць рытм жыцця спартсмена. А Віталь сам так жыве і ўсё разумее, падтрымлівае мяне, як ніхто іншы. Мне падабаецца, што мы разам займаемся лёгкай атлетыкай, хоць і рознымі дысцыплінамі.

***— Колькі ў вас на дваіх медалёў?***

— У Віталіка ў 2018 годзе была «бронза» чэмпіянату Еўропы, цяпер яна ёсць і ў мяне. Атрымліваецца, 1:1. У маіх бацькоў дома ўся сцяна завешана маімі медалямі, у бацькоў Віталя такая ж сітуацыя. Узнагарод вельмі шмат, але пакуль самых галоўных там няма.

***— Іра, твой вопыт у спартыўнай гімнастыцы табе неяк дапамагае ў лёгкай атлетыцы?***

— Мяне абурае, калі людзі думаюць, што калі



я займалася гімнастыкай, то гэта дапамагае мне ў скачках. Усё, што я ўмею ў атлетыцы — гэта вялізная праца, мая і майго трэнера. Калі параўнаць, як выконвала практыкаванні адразу пасля гімнастыкі і як выконваю іх зараз — будзе відавочная розніца. Канешне, цяпер я ўсё раблю на высокім прафесійным узроўні, але зусім не праз тое, што я займалася гімнастыкай. Дзякуючы гімнастыцы ў мяне закладзена спартыўная база, яшчэ з дзяцінства развітыя мэтанакіраванасць, імкненне да перамог і іншыя важныя для спорту якасці.

***— Гэта праўда, што ты захацела скакаць з шастом, калі ўбачыла выступленне алімпійскай чэмпіёнкі, расіянкі Алены Ісінбаевай?***

— Гэта праўда. Не ведаю, чаму мяне гэта так зачапіла. Я проста падышла да мамы і сказала: «Я хачу гэтак жа скакаць, думаю, у мяне атрымаецца». Мама мяне падтрымала. На той момант я ўжо развіталася з гімнастыкай і проста сядзела дома. Мне было 13 гадоў, а ў мяне не было сяброў, знаёмых, хобі. Усё гэта замяніў спорт, і калі ён скончыўся, я сутыкнулася з рэальным жыццём, дзе я адна. Канешне, побач заўсёды былі бацькі, брат, але ж падлетку патрэбныя і сябры, захапленні.

***— У цябе ёсць «заклятая саперніца», якую табе хочацца перасягнуць?***

— Я б сказала, што хачу не перасягнуць кагосьці з саперніц, а скокнуць максімальна высока, так, як ніхто не скакаў. Ужо тры чалавекі ўзляцелі вышэй, чым на пяць метраў, значыць, змогуць яшчэ дзесяць. І я нічым ад іх не адрозніваюся. Але нельга хадзіць вакол канкрэтнай лічбы. Я іду не да лічбавых паказчыкаў, а да максімальнай рэалізацыі сваіх магчымасцяў. Чым больш я ўдасканалю свой бег, тэхніку і іншыя якасці, тым вышэй скокну.

***— Чэмпіянат Еўропы ў Торуні праходзіў без гледачоў. Магчыма, у такіх жа ўмовах будуць праходзіць і алімпійскія спаборніцтвы. Наколькі для цябе важная жывая падтрымка трыбун?***

— Мне патрэбна, каб мяне падтрымлівалі людзі на стадыёне. Асабліва калі я настройваюся на апошнюю спробу. Гледачы пачынаюць падтрымліваць, і я разумею, што не магу не выканаць гэтую спробу максімальна добра. Вельмі адчуваецца энергетыка гледачоў, і яна добра дапамагае. Без гэтага цяжка выступаць. Я, вядома, ужо прывыкла, але, спадзяюся, хутка ўсё зменіцца.

***— У тыя імгненні, калі ты ўжо скокнула і ляціш на мат, аб чым ты думаеш?***

— Думкі бываюць розныя. Калі спроба няўдалая — акрамя «псіхаў» і крыўды на сябе, нічога не адчуваеш. А калі пералятаеш рэкордную для сябе вышыню — гэта неверагоднае выступленне. Проста выбух эмоцый. Я заўсёды крычу, калі лячу. Ад спробы да спробы эмоцыі назапашваюцца, і ў апошняй стрымаць іх ужо немагчыма! А калі ўсё заканчваецца, наступае пустэча. Пасля летняга чэмпіянату Беларусі, калі я скокнула на 4,72 метра, два дні не магла гаварыць, стаяць, хадзіць. Я проста ўсё, што ў мяне было, пакінула ў сектары. Адзін мой знаёмы пасля бронзавага медаля Алімпійскіх гульняў тры дні не мог сказаць ні слова. Спаць немагчыма, асабліва першую ноч. Гэта цікавы і вельмі круты стан арганізма.

***— Назаві, калі ласка, момант, які ты лічыш самым знакавым у тваёй кар'еры.***

— Заваяванне ліцэнзіі на Алімпійскія гульні 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра. Гэта адбылося на маім родным гродзенскім стадыёне, на трыбунах была ўся мая сям'я, сябры. Мне было 23 гады, і скокнула 4,50 метра. Тады я за паўгода дадала 30 сантыметраў і мэтанакіравана ішла да заваявання ліцэнзіі. І тое выступленне было апошнім шанцам адабрацца ў Рыа. І калі апошняя спроба стала ўдалай, і стадыён пачаў апладзіраваць, я зразумела, што чагосьці вартая, магу ісці далей і павінна заўсёды дабівацца перамогі.

***— А былі ў цябе моманты эмацыянальнага выгарання?***

— Гэта здарылася, калі я тры гады запар скакала чатыры метры і ніяк не магла скокнуць вышэй. Перашкаджаў нейкі псіхалагічны бар'ер. Я набірала па хуткасці, па сіле, а скокнуць вышэй ніяк не атрымлівалася. Тады мне дапамагла сустрэча з мужам. Ён мне сказаў, што я магу пераадолець любую вышыню. І праз год я скарыла 4,50 метра. Мой трэнер верыць у мяне, але тут з'явіўся чалавек, які пастаянна мне нагадваў, што я моцная і змагу ўсё. Віталь лічыць, што я навучыла яго скакаць, што вельмі важна для мнагаборца. Я не лезу ў кіданне, спрынт. А што датычыцца скачкоў, магу штосьці параіць, падказаць, калі ён гатовы пачуць мой каментарый.

***— Іра, раскажы, калі ласка, некалькі цікавых фактаў пра сябе.***

— Я ненавіджу сушаную рыбу. Мой муж — рыбак, зімой цэлы дзень правяла з ім на рыбалцы. Было страшэнна холадна, але я гераічна ўсё выцерпела. Я вельмі хачу скокнуць з парашутам. І зараз будзе парадокс — я вельмі баюся вышыні. Баюся лятаць на самалётах, жыву на дзясятым паверсе і баюся з акна глядзець уніз. Аднойчы фобія нават перашкодзіла ў спорце. Я спакойна скакала чатыры метры, а 4,20 не магла, потым пераадолела гэты страх. Падчас выступлення я не думаю аб вышыні, а думаю толькі аб тым, як скокнуць. А вось у штодзённым жыцці вышыня мяне пужае, таму з дапамогай парашута хачу перамагчы гэтую фобію. Я вельмі рамантычны і сентыментальны чалавек. Магу знайсці рамантыку нават у звычайных рэчах. І яшчэ адзін факт — я ніколі не саступаю ў спрэчцы, нават калі ведаю, што я не маю рацыі. Гэта, зразумела, на адносіны ўплывае.

***— На зносіны з мужам?***

— У асноўным, так. Ён мая поўная супрацьлегласць. Я эмацыянальная, запальчывая, узрыўная. Віталь — спакойны, памяркоўны, стрыманы. І калі мы спрачаемся, то збоку гэта можа выглядаць даволі дзіўна. Я крычу, абураюся, а ён — спакойны, як удаў.

***— А ў спорце твая эмацыянальнасць дапамагае ці перашкаджае?***

— Пяцьдзясят на пяцьдзясят. Часта яна ўплывае на адносіны з трэнерам. У некаторых сітуацыях мне варта быць спакайнейшай, а я не магу. Такі тэмперамент у мяне ад прыроды. Скачкі з шастом — гэта спробы. То-бок я павінна паказаць выбух эмоцый, потым сесці, супакоіцца ды чакаць наступнай спробы. А як выключыцца, калі ты ўжо на ўзводзе? І мне прыходзілася вучыцца расслабляцца, бо праз дзве-тры спробы я згарала. На трэніроўках трэнер спецыяльна прымушаў мяне спакойна сядзець, а потым зноў уключацца. Мы выканалі вялізную работу ў гэтым кірунку.

***— Ты ўсю сваю кар'еру ў лёгкай атлетыцы працуеш з адным трэнерам, правільна?***

— Так, з Юрыем Рыгоравічам я з самага пачатку, за столькі гадоў ён мне ўжо як бацька. Неяк так склалася, што мяне заўсёды акружаюць спакойныя і ўраўнаважаныя людзі, супрацьлеглыя мне. І трэнер па характары — такі ж, як і мой муж. Мабыць, таму нам так камфортна разам. Юрый Рыгоравіч ніколі не жадаў мне нічога дрэннага. Ён часта казаў, што калі захачу змяніць трэнера, бо вырашу, што іншы спецыяліст зможа даць мне больш, то ён мяне адпусціць. У нас былі розныя сітуацыі, і часам я нават думала аб пераходзе да іншага настаўніка. Але заўсёды сябе спыняла тым, што менавіта з гэтым чалавекам усяму навучылася, менавіта ён навучыў мяне трымаць шаст, скакаць. І я вельмі рада, што падчас нашых сварак перамагаў здаровы сэнс. Я сама ствараю канфлікты і сама іх вырашаю, першая іду на прымірэнне.

***— Іра, раскрый сакрэт сваёй матывацыі?***

— Пакуль я не выступаю так, як хачу, пакуль я не задаволеная сваімі вынікамі — мне не трэба шукаць матывацыю.

*г. Гродна.*

# ЛЁД ПАМЫЛАК НЕ ДАРУЕ

## Беларусы рыхтуюцца пакарыць свет фігурнага катання

**Два гады таму ў Беларускага фігурнага катання пачалося новае жыццё. Пасля чэмпіянату Еўропы 2019 года ў Мінску градус увагі да гэтага віду спорту вырас у некалькі разоў. Аншлаг у дзіцячых секцыях, запрашэнне замежных спецыялістаў і спартсменаў, лядовыя шоу, буйныя спаборніцтвы, першыя поспехі беларускіх фігурыстаў на міжнародным узроўні — Беларускі саюз канькабежцаў запусціў кола, якое, здаецца, не спыніць. Ды ці трэба яго спыняць?..**

З 22 да 28 сакавіка ў Стакгольме адбудзецца чэмпіянат свету па фігурным катанні. Упершыню за шмат гадоў на планетарным першынстве Беларусь будзе прадстаўлена ва ўсіх чатырох відах. У многім гэта заслуга **галоўнага трэнера нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па фігурным катанні Алега ВАСІЛЬЕВА.** Алімпійскі чэмпіён 1984 года, вучань і калега легендарнай Тамары Масквіной, трэнер многіх знакамітых фігурыстаў працуе ў Беларусі з 2019 года. Спачатку работа была дыстанцыйная, але з лета 2020 года расійскі спецыяліст праводзіць увесь час у Мінску. І разам са сваімі падапечнымі і калегамі піша гісторыю айчыннага фігурнага катання.

«Адбор на чэмпіянат свету прадстаўнікоў усіх дысцыплін стаў магчымы дзякуючы зладжанай і працаглай рабоце вялікай колькасці людзей. І шмат «пазлаў» склалася. Расійская федэрацыя фігурнага катання дала дазвол на выступленне расіян за Беларусь. Міжнародны саюз канькабежцаў гэты пераход адобрыў і пацвердзіў. Міністэрства спорту і турызму, Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па лядовых відах спорту, Беларускі саюз канькабежцаў удзельнічалі фінансава і займаліся дакументамі. Была праведзена велізарная работа, каб мы паехалі на чэмпіянат свету і змагаліся там за алімпійскія ліцэнзіі ў Пекін. Гэта вельмі знакавы для нас чэмпіянат і вельмі хочацца выканаць усе пастаўленыя задачы», — расказвае Алег Кімавіч.

Уся беларуская каманда, акрамя танцавальнай пары, на чэмпіянаце свету — расійскія фігурысты. Аднак дэталі біяграфіі не адмяняюць галоўную задачу — катацца так добра, як спартсмены гэта ўмеюць, і ўпершыню за шмат гадоў «правесці» Беларусь у алімпійскія спаборніцтвы. Алімпійскія ліцэнзіі на чэмпіянаце свету атрымаюць па 16 найлепшых спартсменаў у кожным відзе.

### Герояў трэба ведаць у твар...

У жаночым адзіночным катанні зараз галоўная зорка — Вікторыя Сафонава. Выступаючы пад беларускім сцягам, спартсменка паспела зрабіць многае — выйграла некалькі міжнародных стартаў, прадставіла краіну на чэмпіянаце Еўропы 2020 года. Восенню 2020-га Вікторыя зрабіла сапраўдную сенсацыю: на міжнародным турніры Ice Star у Мінску — аказалася мацнейшай за чэмпіёнку Еўропы 2019 Соф'ю Самадураву. «Мы ўскладаем вялікія надзеі на выступленне Вікторыі ў Стакгольме. З аднаго боку, у яе цяжкая задача, жаночае катанне зараз знаходзіцца на піку свайго тэхнічнага развіцця, дзяўчаты выконваюць нават больш чацвярных скачкоў, чым мужчыны. З іншага боку, задача рэальная. Вікторыя мае шэраг пераваг, якія дазволяць ёй заняць высокае месца і заваяваць пуцёўку на алімпіяду», — заўважыў Алег Васільеў.

Патрымае ў напружанні аматараў лідар беларускага мужчынскага катання Канстанцін Мілюкоў. Па словах Алега Кімавіча, можа здарыцца ўсякае: «Мінулы сезон у Канстанціна быў, шчыра кажучы, правальны. Ён дрэнна выступаў на ўсіх стартах. Мы зрабілі адпаведныя вывады, знялі яго з усіх стыпендый, пакінулі без фінансавай падтрымкі. І гэта спрацавала. Косця плённа працаваў летам на зборах у Раўбічах, Жлобіне, на «Мінскарэне». З пачатку сезона ён паказвае стабільна высокія вынікі, выйграў амаль усе дамашнія старты. Мы спадзяёмся на паспяховае выступленне, Косця можа заняць высокае месца на чэмпіянаце свету. Але ў той жа час ёсць боязь — з мінулага года праз пандэмію ў Косці не было вопыту міжнародных стартаў».

У гісторыі беларускага парнага катання была толькі адна моцная пара — Таццяны Данілавай і Мікалая Каменчука. У 2016 годзе пара распалася, і чатыры гады значных вынікаў у гэтай дысцыпліне не было. Але зараз лёд крануўся. З гэтага сезона за Беларусь выступае расійская пара Багданы Лукашэвіч і Аляксандра Сцяпанава. Трэніруе іх, дарэчы, Мікалай Каменчук. У Стакгольме ад Багданы і Аляксандра прарыўных вынікаў не чакаюць. «Мінулы сезон пара амаль не спаборнічала, ён быў пераходны. Для іх удзел у чэмпіянаце свету будзе стрэсавы, і цяжка прадказаць, як яны сябе стануць паводзіць. Мы яшчэ не бачылі іх на буйных турнірах, у сур'ёзнай абстаноўцы. Дамашнія спаборніцтвы з пустымі трыбунамі — крыху іншае. Багдана і Аляксандр добра падрыхтаваныя тэхнічна, яны здольныя паказаць дастойнае катанне. І калі яны адкатаюць так, як робяць гэта на трэніроўках, вынік будзе нядрэнны», — тлумачыць Алег Васільеў. Падобная сітуацыя і ў танцавальнага дуэта эстонкі Вікторыі Семянюк і беларуса Ільі Юхімука. Першым баявым выпрабаваннем для іх быў этап Гран-пры ў Маскве, дзе яны занялі 10-е месца. «Цяжка прадказаць, як Вікторыя і Ілья пакажуць сябе на чэмпіянаце свету, — адзначае Алег Кімавіч. — Яны зусім маладая, толькі створаная пара. А ў танцах, чым далей і болей пара выступае, тым вышэйшы вынік. Пакуль яны разам прайшлі недастаткова, каб змагацца за нешта сур'ёзнае».

Чэмпіянат свету ў Стакгольме — першы буйны міжнародны турнір за год. З 29 стартаў, унесеных у каляндар Міжнароднага саюза канькабежцаў, 22 не адбыліся, у іх ліку нават чэмпіянат Еўропы. З сямі захаваных тры прыняла Беларусь. «Міністэрства спорту і турызму, Беларускі саюз канькабежцаў зрабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб нашы спартсмены не адчувалі беззнадзейнасць сітуацыі, выкліканую ўсімі абмежаваннямі



Фота Беларускага саюза канькабежцаў.

і адменамі спаборніцтваў. Дамашнія старты дапамагалі ім не страціць форму, але хацелася б, каб яны пакаталіся з больш моцнымі сапернікамі на міжнародных стартах. На жаль, такой магчымасці ў нас у гэтым годзе не было», — наракае галоўны трэнер нацыянальнай зборнай.

### ...І вучыцца ў найлепшых

На першы погляд можа здацца, што запрашэнне легіянераў і іх выступленні на вядучых стартах могуць засмучаць беларускіх спартсменаў. Алег Васільеў тлумачыць, чаму гэта не так: «З распадам СССР у спорце кожнай краіны здарыўся невялікі спад. Усе пачалі сваю гісторыю фігурнага катання, па сутнасці, з нуля. І постсавецкія рэспублікі сталі запрашаць спартсменаў з іншых краін.

Легіянеры запрашаюцца не толькі, каб атрымаць вынік, а для таго, каб задаць планку, стандарт, да якога б цягнуліся спартсмены, народжаныя ў Беларусі. Вельмі карысна мець перад вачыма наглядны прыклад. Можна бясконца расказваць дзецям, што трэба рабіць, паказваць відэа. Але аддаленыя прыклады не даюць належнага эфекту. А калі ёсць магчымасць прыйсці на трэніроўку і ўбачыць, як працуюць найлепшыя ў краіне спартсмены, матывацыя зусім іншая. Маладыя фігурысты пачынаюць трэніравацца лепей і вынік расце. Я гляджу на запрашэнне легіянераў як на непазбежную неабходнасць. Гэта дасць штуршок масаваму фігурнаму катанню ва ўсёй краіне. У нас ёсць яшчэ шэраг праектаў, якія мы плануем правесці, каб павялічыць колькасць дзяцей. А потым з гэтай вялікай колькасці атрымаць сваіх зорачак».

Дарэчы, свае зорачкі на беларускім лёдзе ўжо ёсць. Юніёр Яўген Пузанаў ужо авалодаў такім складаным скачком, як трайны аксель, і зараз актыўна яго ўдасканальвае. Не адстае і Мікалай Казлоў, ён таксама засвоіў гэты скачок і працуе над іншымі складанымі элементамі. У жаночым катанні вялікія надзеі падае Варвара Кісель, якая мае складанейшыя скачкі, напрыклад, каскад з чацвярных і трайных тулупаў. Мілана Рамашова летась на чэмпіянаце свету сярод юніёраў заняла 12-е месца. Спартсменка трэніруецца ў групе алімпійскага чэмпіёна Аляксея Урманава. Па словах Алега Васільева, дзяўчаты здольныя парадаваць высокімі вынікамі.

Бадай, самы папулярны ў Беларусі від фігурнага катання — танцы на лёдзе. «Танцамі сёння займаецца вельмі шмат беларускіх фігурыстаў. Ёсць адно «але» — вынікі. Танцы тэхнічна няпросты від, няхай там няма чацвярных скачкоў, аб'ём патрабаванняў і каноны, якія сёння існуюць у гэтым відзе, вельмі высока паднялі планку. Беларусам пакуль складана да яе падабрацца», — расказаў Алег Васільеў.

У хуткім будучым шэрагі беларускіх фігурыстаў папоўняцца дзвюма юніёрскімі і адной дарослай спартыўнымі парамі. Улічваючы, што парнае катанне — самы цяжкі тэхнічна, фізічна і псіхалагічна від, гэта вялікі крок. «Калі сабраць дзевяць цяжарных жанчын разам, яны за адзін месяц не народзяць. Так і ў спорце. Вынік не прыходзіць у адзін момант. Патрэбна планамерная і доўгая праца. Павінна вырасці маладое пакаленне. Мы спадзяёмся, што беларускае фігурнае катанне будзе калі не настолькі паспяховае, як расійскае, то хоць бы мацнейшае за іншыя краіны», — падкрэслівае Алег Васільеў.

### Талентам — дапамагаць

Можа здацца дзіўным, але ў абавязкі галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай не ўваходзіць работа са спартсменамі на лёдзе. Яго асноўная задача — стварыць сістэму, якая будзе прыносіць свае плады. «Мне не плацяць зарплату за тое, што я працую на лёдзе. Але я ўсё роўна там працую, бо трэнеры і спартсмены абучаюцца не ў кабінетах, а ў рэальных умовах. Я працую з трэнерамі адзіночнага і парнага катання, менш умешваюся ў танцы, для мяне гэта некалькі спецыфічны від, але сачу за арганізацыйнымі момантамі. Мая задача — пабудаваць сістэму, якая будзе прыносіць вынік. Без яе можна атрымаць толькі адзінкавыя поспехі. Як кажуць, талентам трэба дапамагаць, бяздарнасці праб'юцца самі. У Беларусі нараджаюцца таленты. І трэба не проста ім дапамагчы, а стварыць усе ўмовы і сістэму для іх паспяховага развіцця».

Галоўным пастулатам сістэмы развіцця Алег Кімавіч называе трэнерскія кадры, якіх у краіне мала: «Мы ствараем сістэму навучання, якая будзе стымуляваць трэнераў і спецыялістаў пастаянна ўдасканальвацца».

У 2019 годзе ў інтэрв'ю прэсслужбе Беларускага саюза канькабежцаў Алег Васільеў адзначыў, што вялікая праблема беларускіх фігурыстаў — няправільная расстаноўка элементаў у праграмах. Сёння гэта задача, якая паляпшае імідж і вобраз спартсмена, у многіх вырашана. Актыўна вырашаюцца і іншыя. Напрыклад, рэгулярна праводзяцца спаборніцтвы па скачках. «Такія спаборніцтвы вельмі карысныя для спартсменаў. Яны стымулююць пераадольваць бар'еры немагчымасці. Фігурыст пераступае праз свае псіхалагічныя перашкоды і ідзе далей у сваім тэхнічным удасканаленні», — тлумачыць Алег Кімавіч.

Алег Васільеў упэўнены, што расслабляцца рана, гэта толькі пачатак. Напераддзе вялізны спіс іншых важных задач. Фігурнае катанне, нягледзячы на яго прыгажосць, выключае сумненні ў сваіх сілах і слабасць. І беларускія спартсмены збіраюцца ўсім гэта даказаць.

---

У добры шлях!

# ГУЛЬНЯМ У ТОКІА БЫЦЬ

## Алімпійскі агонь пачынае сваё турнэ

**XXXII Летнія Алімпійскія гульні пачнуцца 25 сакавіка. Старт эстафеты алімпійскага агню пад назвай «Надзея асвятляе наш шлях», запланаваны менавіта на гэтую дату, можна лічыць своеасаблівым пачаткам галоўнай спартыўнай падзеі. Пачнецца забег у прэфектуры Фукусіма. Першы пункт эстафеты быў абраны невыпадкова — гэта сімвал аднаўлення Фукусімы і ўсяго паўночнага ўсходу Японіі пасля землятрусу і цунамі 2011 года.**

Забег працягнецца 121 дзень. Факел алімпіяды наведае ўсе 47 японскіх прэфектур. Арганізатары не ўнеслі ніякіх змяненняў у расклад і маршрут эстафеты, распрацаваныя ў 2020 годзе. Акрамя даты пачатку — у параўнанні з леташняй, яна пасунутая на адзін дзень. Падчас забегу будуць прынятыя ўсе меры, якія датычацца прафілактыкі распаўсюджвання каранавіруса: паменшана колькасць транспарту, які едзе за бегунамі з факеламі, скарочана праграма святочных мерапрыемстваў у кожнай прэфектуры. Дакладны маршрут эстафеты арганізатары будуць публікаваць за некалькі гадзін да яе прыбыцця ў рэгіёны. Гэтыя меры прымаюцца, каб пазбегнуць вялікай колькасці людзей, сабраных у адным месцы. Увогуле арганізатары раяць сачыць за прасоўваннем агню ў інтэрнэце. А ўбачыць агонь Гульняў на свае вочы жыхары Японіі змогуць толькі пасля папярэдняй рэгістрацыі заяўкі на спецыяльнай анлайн-платформе.

Агонь Гульняў XXXII Алімпіяды быў запалены 12 сакавіка 2020 года ў Старажытнай Алімпіі. Эстафета стартавала ў Грэцыі, але з-за пандэміі каранавіруса была скарочана. Агонь паспеў прыляцець у Японію яшчэ да рашэння аб пераносе Алімпійскіх гульняў. Лампада з полымем была часова выстаўлена на ўсеагульны паказ у музеі побач з галоўным алімпійскім стадыёнам. Факел Гульняў Алімпіяды ў Токіа прадстаўлены ў сакавіку 2019 года. Яго дызайн нагадвае вобраз квітнеючай сакуры, усім знаёмай і самай любімай японскай кветкі.

Алімпійскі агонь разам з пяццю коламі, сцягам, дэвізам «Citius, Altius, Fortius!» («Хутчэй, вышэй, мацней»), гімнам — паўнавартасны сімвал алімпійскага руху. Агонь яднае антычныя і сучасныя Гульні. Згодна са старажытнагрэчаскай міфалогіяй, агонь, які Праметэй выкраў у Зеўса, — сімвал жыцця, свабоды чалавецтва і яго імкненняў. Цікава, што на першых гульнях сучаснасці ў Афінах у 1896 годзе алімпійскага агню не было. Ён з'явіўся толькі ў 1928 годзе ў Амстэрдаме. І запалілі яго не ў Алімпіі, а ў Нідэрландах. А сучасная цырымонія запальвання ў Алімпіі і эстафета передачы факела былі распрацаваныя напярэдадні Алімпійскіх гульняў 1936 года ў Берліне.

Паводле традыцыі, агонь павінен гарэць на працягу ўсёй Алімпіяды. Аднак бывалі выпадкі, калі алімпійскі агонь згасаў. Часцей за ўсё факел патухаў падчас эстафеты, але часам нават у чашы на стадыёне. У 1976 годзе падчас Алімпіяды ў Манрэалі агонь патух праз праліўны дождж. Адзін з чыноўнікаў вырашыў запаліць яго простай запальнічкай. Арганізатары хутка растлумачылі яму ўсе правілы, патушылі агонь ад запальніцы і зноў запалілі — ужо сапраўдны алімпійскі агонь з рэзервовых крыніц.

Арганізатары кожных Алімпійскіх гульняў накіроўваюць агонь у самыя незвычайныя месцы. У 2008 годзе ён пакарыў Эверэст. У 2000 годзе арганізатары гульняў у Сіднэі адправілі яго пад ваду — аквалангіст пранёс факел праз Вялікі Бар'ерны рыф. У алімпійскай эстафеце 2014 года яго прынеслі праз Паўночны полюс і глыбіні Байкала. У 1996, 2000 і 2014 гадах алімпійскі агонь разам з аўстранаўтамі скараў космас.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 5 апреля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 25 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА ранее опубликован в газете «Звязда» от 20.01.2021 г. № 10 (29379), www.bankrot.gov.by.**
**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснёв Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»**): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001 в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 1 апреля 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Здравушка-милк» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

**- производственный корпус (составные части и принадлежности: склад-пристройка, 3 навеса) с инв. № 601/С-13163 общей площадью 4 112,6 кв. м;**

**- административно-бытовой корпус (составные части и принадлежности: пристройка) с инв. № 601/С-13165 общей площадью 880,4 кв. м;**

**- котельная с инв. № 601/С-29361 общей площадью 25,1 кв. м;**

**- контрольно-пропускной пункт с инв. № 601/С-29555 общей площадью 15,9 кв. м;**

**- канализационно-насосная станция с инв. № 601/С-29556 общей площадью 51,8 кв. м;**

**- водонапорная насосная станция с инв. № 601/С-29554 общей площадью 62,7 кв. м;**

**- сети водоснабжения (составные части и принадлежности: 15 участков водопроводной сети, 6 колодцев, 6 трубопроводных арматур, 2 резервуара запаса воды) с инв. № 601/С-30845;**

**- артскважина (составные части и принадлежности: артскважина, фильтр, электропогружной насос, здание артскважины) с инв. № 601/С-30846 общей площадью 9,5 кв. м;**

**- сети канализации (составные части и принадлежности: канализация хозяйственно-бытовая, 5 трубопроводов, 2 колодца, канализация ливневая, 4 трубопровода, 2 колодца, приямок, отстойник) с инв. № 601/С-30847;**

**- оборудование (роллета защитная 2200*2600 с инв. № 020635, роллета защитная 2200*3250 с инв. № 020636, автоматическая система учета электроэнергии (АСКУЭ) с инв. № 00879, котел КВГТ-100 с инв. № 020254, трансформатор 10-1-1У 50/5 с инв. № 00863, трансформатор ТМЗ 630/10-0,4-82У с инв. № 000088, трансформатор ТМЗ 630/10-0,4-82У с инв. № 000089, трансформатор ТОЛ 10-1-1У 50/5 с инв. № 00861, трансформатор ТОЛ 10-1-1У 50/5 с инв. № 00862, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/5У2 с инв. № 00864, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/10Р 50/5 У2 с инв. № 00865, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/10Р 50/5 У2 с инв. № 00866, трансформаторная подстанция 2КТП-630/10/0,4-84-УЗ с инв. № 000078, трансформаторная подстанция 2КТП-630/10/0,4-84-УЗ с инв. № 000077, градирня ККТ-50 с инв. № 020169, градирня ККТ-50 с инв. № 020170, градирня ККТ-50 с инв. № 020171, градирня ККТ-50 с инв. № 020172).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623250100001001429 площадью 1,5918 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Я. Купалы, 15.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Гайна, пл. 1,5918 га.*

Часть административно-бытового корпуса находится в аренде (сведения можно получить у организатора аукциона).

Начальная цена с НДС (20 %) – **2 186 786,70** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 10 %* (задаток 10 % от начальной цены – **218 678,67** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB 30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 (одного) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 14.05.2020, 24.07.2020, 21.08.2020, 09.10.2020, 13.01.2021.

Аукцион состоится **14.04.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.04.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**

УНП 600126511

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

